Пралетары ўсіх краін, еднайцеся!

ЛІТАРАТУРА І МАСТАЦТВА

ОРГАН ПРАЎЛЕННЯ САЮЗА СОВЕЦКІХ ПІСЬМЕННІКАЎ БССР І УПРАЎЛЕННЯ ПА СПРАВАХ МАСТАЦТВАЎ ПРЫ СНК БССР

№ 5 (504) | Субота 1 лютага 1941 года | Цана 20 кап.

Наша проза

Набліжаецца агульны сход пісьменнікаў, прысвечаны вынікам беларускай прозы за 1940 год. Склікаемы па ініцыятыве праўлення ССП БССР творчы сход празаікаў мае сваёй мэтай падагуліць станоўчы вопыт і намеціць вехі далейшага развіцця асноўнага і рашаючага жанру нашай літаратуры—прозы.

Якія праблемы, звязаныя з развіццём і ростам нашай прозы, павінны вызначыць напрамак дыскусіі? Перш за ўсё, праблема ідэйнага і тэматычнага пашырэння прозы. Стала ўжо агульным месцам паўтараць, што проза недастаткова смела авалодвае ўсім багаццем тэм соцыялістычнай рэчаіснасці. З гэтай справядлівай заўвагі, якая рэгулярна паўтараецца з году ў год, празаікі не зрабілі яшчэ адпаведных практычных вывадаў: соцыялістычная сучаснасць па-ранейшаму адсутнічае ў іх творах, новы чалавек, герой нашых дзён яшчэ не стаў героем нашых кніг. Адзіная паявіўшаяся ў 1940 годзе кніга аб калгаснай рэчаіснасці—раман Р. Мурашкі «Салаўі святога Палікара» трактуе ўсё-ж падзеі не сёняшняга калгаснага жыцця, а няданяе мінулае —перыяд абвостранай барацьбы з кулацтвам. А жыццё, між тым, шагнула далёка ўперад. Соцыялізм увайшоў у быт, у прывычкі і навыкі людзей. Вырае новы, соцыялістычны чалавек, які дасканала валодае мастацтвам натхнёнай працы, чалавек глыбока мыслячы, які імкнецца пазнаць свет ва ўсёй яго рознастайнасці, чалавек, які ў роўнай меры валодае і молатам і вінтоўкай—паказаць яго на ўвесь рост сродкамі мастацкага слова ёсць першачарговая задача нашых пісьменнікаў.

Зроблена-ж пакуль яшчэ мала. У нас зусім няма твораў, услаўляючых значэнне соцыялістычнай працы, як справы чэсці, славы, доблесці і геройства. Класічная літаратура мінулага дала незабыўныя вобразы сізіфавай працы шматмільённых народных мас. Прыгадаем раманы Э. Заля аб працы і людзях працы. Дзе-ж нашы, **соцыялістычныя** раманы аб творчай працы, рэабілітыраванай новымі чалавечымі ўзаемаадносінамі? У рускай совецкай прозе намячаліся асобныя спробы стварыць такія кнігі (скажам, «Танкер «Дэрбент» Ю. Крымава), а ў беларускай не было нават і спробы зрабіць што-небудзь у гэтым напрамку. У лепшым выпадку, калі нашы творы трактуюць праблему адносін новага чалавека да працы, яны не ідуць далей паказу працы, як працэсу **фізічнай** затраты чалавечай энергіі. Героі нашых кніг прыходзяць у захапленне ад аднаго адчування стомленасці, ад аднаго выгляду мазалёў. Такія «станоўчыя» адносіны да працы зусім не адпавядаюць таму, што адчуваюць людзі сапраўды **натхнёнай**, суправаджаемай вялікай **ідэяй** соцыялізма гераічнай працы. Вось гэтай **ідэі** новай працы якраз і няма ў творах нашых пісьменнікаў. У выніку рэзка зніжаецца ўзровень мыслі твораў.

Набліжаецца вялікая дата—25-годдзе Совецкай улады, якую наша проза павінна сустрэць высокамастацкімі творамі. Гераічны вопыт барацьбы за Соцыялістычны Кастрычнік ва ўмовах Беларусі чакае яшчэ сваіх мастакоў. Велізарная роля Леніна, Сталіна і іх бліжэйшых саратнікаў: Свердлава, Фрунзе, Орджанікідзе, Кагановіча ў стварэнні беларускай дзяржаўнасці павінна захапіць нашых пісьменнікаў на напісанне поўнацэнных мастацкіх твораў. Няма яшчэ ў нашай прозе і твораў, прысвечаных тэме гераічнай барацьбы беларускага народа за сваё соцыяльнае і нацыянальнае вызваленне ў больш далёкім мінулым. Нашы празаікі яшчэ не прыступалі к мастац-

Новыя творы

Якуб Колас

На „крэсах усходніх“

Раздзел III з часткі II паэмы*)

1.

Пляцоўка Богута і хата
У вочы кідаюцца ўсім.
Што ні кажы, дзялка і хвата
Прызнаць адкрыта трэба ў ім.
Не так даўно расце сядзіба,
А паглядзі, што ёсць у ёй:
Садок, альтанка ў форме грыба,
Дзе ўтульнасць знойдзеш і спакой;
Гумно, свіронак і адрынка.
Блішчыць на хаце белы дах,
Антэна тоне ў небясах,
А сырасушка, як дзяўчынка.

2.

Крыха паводдаль пры паркане
Стаіць вендлярня, як гайдук,
Або манах які ў сутане,
Сухі, высокі і без рук.
З пагорка ўніз, у бок даліны,
Збягае сцежка між кустоў,
Дзе рэчка ў шатах зеляніны
У луг адходзіць ад платоў.
А від які з пляцоўкі гэтай!
Відаць мястэчка, лес, рака,
Пасёлак, хатка рыбака,
Палі пад збожжавай сурвэтай.

3.

Куды ні глянь, на кожным кроку
Самой сядзібы і двара
Відаць уважлівае вока,
Стараннасць, густ гаспадара.
Гараць, як стужкі, каля хаты
Дарожкі з клумбамі. На іх
Арол красуецца дзюбаты —
Краса паноў, іх гордасць, пых.
І ўсё вядзецца ў панскім плане,
І ўсё прамерана пад шнур,
Бо ёсць адна з усіх культур —
Культура польская, васпане.

4.

Пан Богут — польскасці апора,
Яе нястомны праваднік,
І многа мае ў ёй прастору,
Пажывы шчыры каталік.
І ўсё ён ведае і знае,
Хто дыша чым, што чым жыве,
Нібы па кнізе ён чытае
Чужыя мыслі ў галаве.
Затое-ж ён так хіліць, горне
К сабе паноў і панскіх слуг,
Пан секвестратар яго друг,
У дружбе з ім і пан каморнік.

5.

Ды не адным панам, падпанкам
Вядомы Богут, як дзялок,
Яго сяляне і сялянкі
Таксама знаюць на зубок,
І знаюць так, што сцерагуцца
Яго, як скулы ці агню:
Няма за ім дзе павярнуцца
Ні свінням, курам, ні каню.
Цяля часамі зойдзе ў шкоду,
Ці ступіць курка ў агарод —
Не абярэшся з ім згрызот,
І толькі штрафам купіш згоду.

6.

Калі не штраф, дык адработкі,
Ды ён гатоў ісці на ўсё:
Часамі ўчыніць суд кароткі —
Застрэліць курку, парасё,
Яшчэ й маралы прачытае,
Ці тэзіс выставіць аб тым,
Што хлоп—быдлё і што крутая
Павінна быць расправа з ім;
На від паставіць дух комуны
І грэшны край большэвікоў.
Не, васпан: лад тут не такоў,
Не тыя ў Польшчы граюць струны.

Кабета, васпан... разумей».
І земным вокам ён, як злодзей,
Павёў тайком з кутка ў куток —
І мыслі грэшныя ў ім бродзяць,
Як уварваць чужы кусок.
Ды тут рабі, васпане, тонка,
Каб не нажыць сабе трывог,
Каб ведаў толькі ты ды бог
І не здагадвалася жонка.

11.

А тут яна, як па заказу,
Якраз ідзе к яму ў пакой.
Ну, нібы сцяміла адразу
Няверных дум яго развой.
Але пан Богут не дасць маху,
Ён гоніць дур той з галавы,
І грэшных дум няма і паху,
Ён від прымае дзелавы.



Якуб Колас
Фота І. Каплінскага.

Ды як пан Богут ні хітруе,
Каб ад яе свой юр схаваць,
Мальвіну трудна ашукаць,
Дружачку верную старую.

12.

Так і цяпер, хоць мімаходам,
Каб папярэдзіць зло спакус,
Яна заўважыла: «Мікодым,
А для каго задраў ты вус?»
І паківала галавою,
Нібы шлючы яму дакор.
На шчасце гэтаю-ж парою
Вароты скрыпнулі ў іх двор.
І сам пан Богут і Мальвіна
Падходзяць хутка да акна —
Якая-ж гэта навіна?
Хто едзе позняю часінай?

13.

— То-ж пан Пшэбора, пан Валенты! —
Сумнення болей не было.
Мальвіна ўзрушана дашчэнту,
Яна-ж не ўбрана, як на зло, —
І стрымгалоў у бакавушку
Імчыцца свой змяніць убор,
А сам пан Богут, нібы птушка,
З свяцёлкі выляцеў на двор,
І [illegible]

Каханак Богутаў, Адась.
— Ну, прывітайся-ж, сынку, з панам.—
З Адасем клопат у бацькоў:
Пасябраваўся ён з мужланам,
Гаворыць мовай мужыкоў,
Выходзіць з польскага уплыву.
Бяда і сорам з ім адзін:
Бярэ у ім верх беларусін
І на чужую хіліць ніву.

18.

Пытанне — дзе шукаць ратунку?
Як знішчыць шкодны гэты дух?
Пшэбора — дзеяч з пастарунку,
Не просты дзеяч, — хват і зух.
Цяпер пан Богут і Пшэбора
Вядуць размову сам-на-сам.
Іх тэма — Богутава гора
І процівага мужыкам.
Ды ў госця тут няма сумнення.
Што беларускасць? пыл і дым!
І засмучацца няма чым:
Няма ў культуры іх карэння.

19.

І разышоўся пан Валенты,
Надзьмуты польскі патрыёт.
У Польшчы ўсе ёсць элементы,
Каб смела рухацца ўпярод.
І ёй ніпто не пагражае
Пад спягам белага арла.
Не ступіць ту нага чужая,
Чыя-б яна там ні была,
Бо Польшча — гэта шчыт Еўропы,
За Польшчу бог, за Польшчу люд,
І сама Польшча — божы цуд,
То што ёй значаць тых хлопы?

20.

Гаворыць госць з такім запалам
І так узносіць паляка
І польскі дух, і тую хвалу
Аб ім, што слыне здаляка;
Культуру, воінскую славу,
Дзяржавы польскай развіццё.
Ён сам за Польшчу, за Варшаву
Гатоў аддаць сваё жыццё.
Яшчэ-б ён больш перабраў меру,
Калі-б Мальвіна не прышла
Прасіць прамоўцу да стала
На «небагатую» вячэру.

21.

Як першы снег, абрусам белым
Засланы стол, а на стале...
Абегла глянеш, скажаш смела:
«Вось гаспадыня, дык але».
Як сонца свецяцца талеркі,
Зіхцяць відэльцы і нажы,
Сурвэткі — ну, чысцей паперкі,
Хоць гімн адразу ім злажы!
А закусь! Што тут за вэндліна!
А паляндвіца, а той сыр!
Адна смятана ў ім і жыр,
Ды кропкі чорненькія кміну.

22.

І Богут ведае парадак —
Ідзе паважна ў свой буфет
І дастае бутэльку... «Дзядэк» —
Напіткаў польскіх гонар, цвет.
Хвала той дзедавай асобе:
І чарка ў гумар прывядзе.
Пітво такое ў Польшчы робяць,
І толькі ў Польшчы, больш нідзе.
Кульнулі чарку за Мальвіну,
Другую за гаспадара,
І госцю выпала пара, —
Пілі за славу, за айчыну.



Да надыходзячай XVIII Усесаюзнай партканферэнцыі ў Маскве адкрываецца выстаўка графікі на тэмы гісторыі ВКП(б). У выстаўцы ўдзельнічаюць віднейшыя мастакі Совецкага Саюза, у тым ліку рад беларускіх. **На здымку:** адзін з экспанатаў БССР: **«В. В. Куйбышаў у ссылцы ў Туруханскім краі, 1916—1917 годы»**, рысунак мастака-ордэнаносца **Е. Зайцава.** Фотарэпрадукцыя І. Каплінскага.

Пашыраць шэфства над мастацкай самадзейнасцю

Да адкрыцця І Усебеларускай канферэнцыі па шэфству над мастацкай самадзейнасцю

З вялікай радасцю сустрэлі акторы, мастакі, музыканты клубных і калгасных гурткоў заклік выдатных майстроў сцэны—народных артыстаў СССР І. Масквіна і В. Барсавай аб шэфстве над мастацкай самадзейнасцю. Пачын І. Масквіна і В. Барсавай быў падхоплен усімі тэатрамі Совецкага Саюза.

На рэпетыцыі самадзейных гурткоў прышлі лепшыя акторы, рэжысёры прафесіяльных тэатраў. Яны дапамаглі гурткам стаць на правільны творчы шлях, адыйсці ад прымітыўных форм.

Змяніўся рэпертуар драматычных гурткоў. На сцэне клубаў, дамоў соцкультуры усё часцей пачалі паяўляцца лепшыя п'есы совецкіх драматургаў: «Любоў Яравая» К. Трэнёва, «Партызаны» К. Крапівы, «Пагібель воўка» Эд. Самуйлёнка, творы рускіх і заходнееўрапейскіх класікаў: Астроўскага, Гогаля, Чэхава, Шэкспіра, Мальера, Гальдоні.

Выраслі творчыя кадры мастацкай самадзейнасці. Расквітнела народная творчасць. Далёка за межамі нашай рэспублікі вядомы жаночы харавы ансамбль калгаса імя Леніна пад кіраваннем тав. Кашко (Шклоўскі раён), ансамбль песні і пляскі Гомельскага клуба чыгуначнікаў, калгасны хор Рэчыцкага раёна пад кіраваннем Таццяны Лапацінай. Творчасць гэтых ансамбляў з вялікім поспехам дэманстрыравалася на дэкадзе беларускага мастацтва ў Маскве. Рад работнікаў мастацкай самадзейнасці адзначан высокімі ўзнагародамі—ордэнамі і медалямі Совецкага Саюза.

Аднак, творчае садружаства работнікаў самадзейнага мастацтва з майстрамі сцэны рэспублікі, якое была дасягнута ў часе падрыхтоўкі да дэкады, не замацавана ў далейшай рабоце. Прадаўжаюць сістэматычную дапамогу драмгурткам заводаў імя Варашылава, імя Кірава (Мінск) майстры нашай сцэны В. Уладамірскі, К. Саннікаў, С. Бірыла. Цікавую работу ў драмгуртку фабрыкі «Профінтэрн» (Віцебск) праводзіць П. Малчанаў. Артыст філармоніі тав. Рабіновіч сістэматычна два разы ў месяц выязджаў у калгас імя Куйбышава (Бабруйскі раён), дзе кіраваў духавым аркестрам (за апошні час гэтыя выезды па віне Дома народнай творчасці БССР спыніліся). Канкрэтную дапамогу самадзейным гурткам школы ФЗА аказваюць акторы Баранавіцкага тэатра.

Але многія работнікі мастацтваў рэспублікі вельмі хутка забыліся аб сваіх урачыстых абавязацельствах перад мастацкай самадзейнасцю. У радзе выпадкаў гэта прывяло да таго, што асобныя самадзейныя калектывы спынілі творчы рост. Цікавы мастацкі калектыў—Дзержынскі ансамбль народных інструментаў, які з поспехам выступаў на Усесаюзнай сельскагаспадарчай выстаўцы, амаль зусім спыніў сваю работу.

Забылі аб сваіх абавязацельствах Дамы народнай творчасці, Беларускі рэспубліканскі камітэт саюза работнікаў мастацтваў. Створаная пры БРК саюза работнікаў мастацтваў спецыяльная камісія па кантролю за ажыццяўленнем шэфства над мастацкай самадзейнасцю збіралася толькі адзін раз.

Правільны і скаргі творчых работнікаў тэатраў на Дом народнай творчасці БССР, работнікі якога не толькі не аказваюць самі патрэбнай творчай дапамогі самадзейным гурткам, але не ўмеюць і арганізаваць гэту дапамогу. Зусім ухіліўся ад шэфскай работы Саюз совецкіх кампазітараў БССР.

Аднак, няправільна было-б лічыць, што за ўсю работу з мастацкай самадзейнасцю адказваюць толькі работнікі тэатраў. Асноўную адказнасць нясуць за яе фабкомы, комсамольскія камітэты прадпрыемстваў, клубы. А ёсць шмат выпадкаў, калі клубы не ствараюць патрэбных умоў для работы самадзейных калектываў. Напрыклад, па віне загадчыка Мінскага клуба металістаў не раз зрываліся заняткі клубнага драмкалектыва.

Недастаткова цікавяцца работай самадзейнасці і асобныя нашы парткомы і РК КП(б)Б. Добрую ініцыятыву праявілі толькі Віцебскі гарком і Сталінскі РК КП(б)Б гор. Мінска, якія правялі спецыяльныя нарады з кіраўнікамі клубаў, з акторамі па пытанню шэфства над мастацкай самадзейнасцю.

У самадзейных гуртках нашай рэспублікі прымаюць удзел дзесяткі тысяч таленавітых рабочых, калгаснікаў, служачых, студэнтаў. Гурткі мастацкай самадзейнасці заклікаюць адыграць вялікую ролю ў справе выхавання мільённых мас гледачоў у духу комунізма. Гэта—ганаровая і адказная справа, якая патрабуе ад нас сур'ёзнай увагі і штодзённай практычнай дапамогі. Вось гэтай канкрэтнай дапамогі, а не ўрачыстых абяцанняў, чакаюць гурткі мастацкай самадзейнасці.

На-днях адкрываецца І Усебеларуская канферэнцыя, прысвечаная шэфству майстроў тэатраў над мастацкай самадзейнасцю. У канферэнцыі прымуць удзел, апрача творчых работнікаў БССР, і віднейшыя майстры Совецкага Саюза, зачынальнікі шэфства над мастацкай самадзейнасцю—Барсава, Міхоэльс. Работа канферэнцыі ўзбагаціць творчых работнікаў мастацтваў вопытам па шэфству над мастацкай самадзейнасцю.

Вл. СТЭЛЬМАХ.

На пасяджэнні выставачнага камітэта

30 студзеня ў мінскім Доме мастака пад старшынствам сакратара ЦК КП(б)Б тав. М. В. Кулагіна адбылося чарговае пасяджэнне Рэспубліканскага выставачнага камітэта. На пасяджэнні абмеркаваны пытанні падрыхтоўкі мастакоў да Усесаюзнай выстаўкі «Наша радзіма» і Усебеларускай выстаўкі, прысвечаных 25-годдзю Вялікай Кастрычніцкай соцыялістычнай рэволюцыі.

З інфармацыяй аб ходзе падрыхтоўкі да выставак выступіў старшыня праўлення Саюза мастакоў БССР тав. І. Рубінштэйн. Да 30 студзеня ад мастакоў Совецкай Беларусі паступілі 84 заяўкі на работы для рэспубліканскай выстаўкі. Не прадставілі яшчэ сваіх заявак 12 мастакоў, сярод іх т.т. Пашкевіч, Ахрэмчык, Андруховіч, Пікус, Берман і інш. Большасць мастакоў заявілі тэмы з гісторыі барацьбы нашага народа за сваё соцыяльнае і нацыянальнае вызваленне. Не паступіла яшчэ заявак на тэмы: «Кастрычнік на Беларусі», «Першы з'езд КП(б)Б», а таксама на тэмы нашай сучаснасці.

У абмеркаванні пытанняў прынялі ўдзел т.т. Тарасікаў, Бразэр, Бембель, Грубэ, Эйдэльман, Зайцаў, Азгур, Керзін, Красоўскі. Усе яны гаварылі аб тым, што выстаўкі 1942 года з'явяцца сур'ёзным выпрабаваннем іх творчай сталасці.

У заключэнне выступіў тав. Кулагін. Ён заклікаў мастакоў Беларусі да натхнёнай работы па падрыхтоўцы к выстаўкам 1942 года.

Выставачны камітэт вызначыў апошні тэрмін здачы эскізаў работ для выставак 1942 года—1 чэрвеня, а для пейзажыстаў—1 верасня 1941 года. На пасяджэнні былі абмеркаваны першыя эскізы (Хрусталёва, Мільчына і Аншэлевіча). Для экспаніравання на выстаўцы «Ленін і Сталін—арганізатары БССР» зацверджаны карціны «Ленін у Разліве» Сонкіна і «Калгасная брыгада на адпачынку» Даўгяла.

А.

Перац Маркіш у Мінску

Гэтымі днямі Мінск наведаў вядомы яўрэйскі паэт-ордэнаносец Перац Маркіш.

25 студзеня тав. Маркіш чытаў калектыву Дзяржаўнага Яўрэйскага тэатра БССР сваю новую п'есу—«Колнідрэ», вельмі цёпла сустрэтую слухачамі.

У той-жа вечар П. Маркіш сустрэўся з яўрэйскімі пісьменнікамі Мінска. На вечары тав. Маркіш сказаў вельмі цікавую прамову аб той велізарнай рабоце, якая чакае яўрэйскіх пісьменнікаў Совецкага Саюза напярэдадні 25-годдзя Вялікай Кастрычніцкай соцыялістычнай рэволюцыі. Вельмі многа ўвагі аддаў тав. Маркіш пытанню раз'еднанасці маскоўскай, кіеўскай і мінскай груп яўрэйскіх пісьменнікаў — раз'еднанасці, якая дасюль яшчэ існуе, але з якой трэба пакончыць.

У абмеркаванні ўзнятых тав. Маркішам пытанняў прынялі ўдзел т.т. Сярэбраны, Аксельрод, Платнер, Эрэнгрос (рэдактар газеты «Окцябр»), Груб'ян, Шведзік, Бярозкін, Цырлін, Ліфшыц, Эліс і Фінкель.

В.

Юбілей Паўло Тычыны

Паўло Тычына

28 студзеня грамадскасць Савецкага Саюза адзначыла 50-годдзе з дня нараджэння і 30-годдзе літаратурнай дзейнасці выдатнага ўкраінскага паэта-ордэнаносца, члена Акадэміі навук УССР — Паўло Грыгоравіча Тычыны.

Трыццаць год назад, падтрымліваемы спачувальнымі водгукамі Кацюбінскага, пачаў сваю паэтычную дзейнасць Паўло Тычына. «Сонечныя кларнеты» — называлася яго першая кніга. І сапраўды, у першых ужо вершах паэта пераліваліся і спявала непераймальным сонечным кларнетам радасць пазнавання жыцця, шчасце асалоды жыццём, сонцам, паветрам. Праўда, паэтычныя адчуванні ранніх вершаў Паўло Тычыны, яго першай кнігі, былі некалькі аддалены ад драматызму сапраўднага жыцця, у іх паэт карыстаўся яшчэ сродкамі і метадамі сімвалізма. Але затое які гэта быў сімвалізм! Не кніжна-вычварны, па-бальмантаўску безжыццёвы, — новая, пявучая музыкальная стыхія, зачэрпнутая непасрэдна з крыніц народнай мовы, вольна і шырока разлілася ў «Сонечных кларнетах».

Ужо ў першай сваёй кнізе Паўло Тычына паказаў сябе паэтам надзвычайнай музыкальнасці, беззаганнага рытмічнага слыху, паэтам, які ўмее будаваць верш на самых няўлоўных адценнях сэнсу, рытму, інтанацыі.

Праз усю сваю творчасць пранёс паэт выдатнае ўменне майстра прымусіць самае звычайнае слова гучаць непераймальнай паэзіяй. Слова палкам падуладна Паўло Тычыне. Можна сказаць, што ён выгінае яго, як падкову, карыстаючыся выразам аднаго з выдатных вершаў паэта. І вельмі характэрна, што, застаючыся да канца патрабавальным і строгім майстрам, бясконца чулым да гучання і найменшых адценняў паэтычнай формы, Паўло Тычына ніколі не быў фармалістам, г. зн. паэтам бяздушных фармальных пошукаў. Фармалізм не прыстаў к Паўло Тычыне.

Паўло Тычына заўсёды добрай зайздрасцю зайздросціў сіле і дзеянню тых вершаў, якія «прыводзяць у рух тысячы год мільёнаў сэрцы». Ён захапляецца вялікім Шаўчэнкам, і ў адным з сваіх вершаў, чытаючы і перачытваючы свае творы і творы паэтычных аднагодкаў, з горыччу адзначае: «І ўсё-ткі ў нас не так, як у Тараса».

Паўло Тычына заўсёды імкнуўся к таму, каб у яго вершах гаварыла і спявала жывая народная душа так, як яна гаварыла і спявала ў вершах Шаўчэнкі. І паэт у многім дасягнуў сваёй мэты. Калі ў ранніх вершах Паўло Тычыны, у «Сонечных кларнетах», народная душа раскрываецца нам у самым нястрымным патоку музыкальных рытмаў, дык у наступных сваіх кнігах паэт пачынае усё больш чотка і поўна выражаць соцыяльна-грамадскую накіраванасць народнай свядомасці, рэвалюцыйнасць народа, які заваяваў сабе ў гераічнай барацьбе з ворагамі новае жыццё, новае шчасце. Сімвалічны пейзаж ранніх вершаў Паўло Тычыны саступае месца новай рэалістычнай канкрэтнасці. Голас паэта у «Плузе», у «Ветры з Украіны» і ва ўсіх далейшых яго кнігах пачынае гучаць мужна і сурова. Бязмежна любячы сваю радзіму, знаходзячы ў сабе самыя пяшчотныя і пранікнёныя словы, каб выразіць гэту любоў, Паўло Тычына ў той-жа час знаходзіць поўныя гневу і нянавісці словы, каб заклейміць «жоўта-блакітную» пятлюраўскую сволач, што ўсе свае разважанні аб «нацыянальным адраджэнні» Украіны пацвярджала рэкамі народнай крыві.

З кнігі ў кнігу, са зборніка ў зборнік расла і шырылася грамадская свядомасць Паўло Тычыны. Безупынна пашыраючы ідэйны і тэматычны кругагляд сваёй паэзіі, заваёўваючы вершам новыя галіны народнага жыцця, Паўло Тычына стварыў вялікую колькасць лірычных і эпічных твораў, якія моцна ўвайшлі ў свядомасць народа. Незабыўны яго творы: «На майдане»—лаканічны, па-майстэрску пабудаваны верш аб вялікай народнай рэвалюцыі; «Як упаў-жа ён з каня» — верш, прысвечаны гераічнай гібелі рэвалюцыянера; выдатныя вершы аб Кажамяку, аб паветраным флоце, што пралятае над хутарам, над здзіўленай дзяўчынкай у стэпу...

Шмат добрых вершаў даў Паўло Тычына савецкаму чытачу. Асабліва запомніліся яго вершы са зборнікаў «Партыя вядзе» і «Пачуццём сям'і адзінай», у якіх Паўло Тычына выступае тэмпераментным і страсным прапагандыстам ідэй бальшавіцкай партыі, песняром сацыялістычнай перабудовы свету. У гэтых кнігах Паўло Тычына выступае вялікім майстрам баявога публіцыстычнага верша, па-ранейшаму багатага самымі рознастайнымі адценнямі сэнсу і інтанацыі, па-ранейшаму выразнага, але па-новаму дзейснага і мэтанакіраванага.

У Паўло Тычыне здзіўляе заўсёдная насцярожанасць яго творчай волі, яго пачуццё навізны, яго выдатнае ўменне папярэджваць ахладжэнне і аўтаматызацыю верша. Паўло Тычына ніколі сябе не паўтарае; ён заўсёды шукае новыя, не быўшыя яшчэ ў паэтычным ужытку сродкі ўздзеяння на чытача. Нават гекзаметр, якім напісана паэма «Сабля Катоўскага», робіць уражанне самастойна народжанага, творча-выпрацаванага прыёму. Адкуль гэта выдатная якасць Паўло Тычыны? Дзе чэрпае ён сокі сваёй творчай маладосці? Ён чэрпае іх, перш за ўсё, у жывой і актыўнай народнай практыцы, у вытоках народнай мовы і — што самае важнае — не толькі ўкраінскай, але і іншых народаў Савецкага Саюза.


Пра Паўло Тычыну нельга сказаць, што ён выражае ідэю дружбы народаў СССР, — гэта ідэя вызначае самую сутнасць яго паэтычнага існавання, фарміраванне яго паэтычнага мышлення, яна стварае музыку яго вершаў. Паўло Тычына знаходзіць «першародства ў глыбінях слоў чужой мовы», ён бясконца ўзбагачае сваю ўласную творчасць, перакладаючы Пушкіна, Блока, Туманяна, Чаўчавадзе, Шварцмана. Паэтычныя пераклады Паўло Тычыны асветлены такой глыбокай павагай да культуры іншых народаў, што яны перарастаюць рамкі культурна-паэтычнай з'явы, набываючы велізарны этычны сэнс ідэі сацыялістычнага інтэрнацыяналізма.

30-годдзе сваёй творчай дзейнасці Паўло Тычына сустрэў у напружанай рабоце над вялікай паэмай аб Шаўчэнку і Чарнышэўскім.

Паэт-грамадзянін Паўло Тычына выбран дэпутатам у Вярхоўны Савет Украінскай ССР. Ён праводзіць вялікую грамадскую работу, вядзе абшырную перапіску са сваімі выбаршчыкамі. Непасрэдная і жывая сувязь са сваім народам натхняе паэта на стварэнне новых вершаў, услаўляючых вялікую сталінскую эпоху, яе справы, яе людзей.

У дзень 50-годдзя жыцця і 30-годдзя творчасці рэдакцыя газеты «Літаратура і мастацтва» і яе чытачы горача вітаюць Паўло Тычыну — выдатнага паэта-наватара, вялікага майстра савецкай паэзіі, сцвярджаючага з Маякоўскім, з Асеевым, з Купалай яе сусветна-гістарычны аўтарытэт і значэнне.

Пажадаем Паўло Грыгоравічу Тычыне яшчэ шмат год жыцця і работы на карысць сацыялістычнай культуры.



Паўло Грыгоравіч Тычына. Фота Г. Вайль.

Кіеў, Паўло Тычыне

Мы шчаслівы яшчэ раз сардэчна вітаць Вас, дарагі Паўло Грыгоравіч! Высокая ўзнагарода партыі і ўрада, урачыстыя дні Вашага юбілея сведчаць аб вялікай любві ўсіх народаў Савецкага Саюза да Вашай таленавітай творчасці.

Гарачае прывітанне і найлепшыя пажаданні з Савецкай Беларусі! Ад душы жадаем шмат год жыцця, здароўя, сіл і натхнёнай творчасці на славу радзімы.

Я. Купала, Я. Колас, З. Бядуля, К. Крапіва, П. Броўка. М. Лынькоў, П. Глебка, К. Чорны.

Паўло Тычына

Гаі шумяць

Гаі шумяць —
Я слухаю.
Хмаркі бягуць —
Углядаюся.
Углядаюся, пытаюся,
Чаго душы маёй
Так весела.
Гэй, звон гудзе
Дзесь здалеку.
Рой дум прадзе
Над нівамі,
Над нівамі — раслівамі,
Купаючы мяне,
Бы ластаўку.
Я іду, іду,
Узрушаны.
Кагось знайду,
Спяваючы,
Спяваючы, кахаючы,
Пад ціхі шэпт траў
Галубячы.
Штось крозіць гай
Над рэчкаю.
Той неба край
Як золата.
Бы золата — паколата
Гарыць-блішчыць рака,
Як музыка.

Пераклаў **Я. Колас.**

На майдане

На майдане каля царквы
Рэвалюцыя ідзе.
— Хай чабан, — усе сказалі, —
Смела ў бой нас павядзе.

— З воляй вернемся, бывайце!
Гэй, на коні, хутка ў путь!
Закіпела, зашумела —
Сцягі яркія цвітуць.

На майдане каля царквы
Маці кажа: «Сын, бывай!»
— Ой, ты, месяц, ясны месяц,
Ім дарогу асвятляй.

На майдане пыл спадае.
Даль знікае з воч.
Вечар.
Ноч.

Пераклаў **Р. Казак.**

Паўло Тычына

Другая песня трактарысткі

Як Алесю Кулік бабы зямлёю абкідалі

Каму жарты, каму смешкі,
а ў мяне зашмат клапот:
у Керменшчыне аблогі
не араны трыццаць год!

Трыццаць летаў...Комсамольцы!
Нам гуляці не рука.
Пааралі, парабілі
там, дзе ШахвАросціўка,—

ды паедзем-жа мы далей,
ды парэжам там груды,
ды аблог узнімем дружна,
хай цвярды ён, найцвярды.

Нас чатыры трактарысты
з брыгадзірам на чале,—
толькі сядзем на машыны—
на зямлі глыбокі след.

Трактарыстам і не ў думках,
не прышло зусім на толк,
што насупраць наступае
бабскі ўласніцкі полк.

А здалёку п'яны лодыр
крывуляе па стэпу,
ў словы б'е, як у цымбалы,
прытанцоўвае ту-пу!

Бабы, гэй, давайце топу.
Дачакаем ім патопу!
Абдыму вас, палюблю,
у гарэлцы патаплю.

Каму жарты, каму смешкі,
а ў мяне зашмат клапот:
у Керменшчыне аблогі
не араны трыццаць год!

Ох, і колькі-ж трэба волі,
колькі розуму і сіл!
...А заходзь, заходзь араці
першым Яшны Васіль.

Трактарам Васіль заходзіць,
толькі штосьці плуг не так...
бабы тут затанцавалі:
пуд ад бога, хрыста-бога!
Дзіва госпада хрыста!

Ах, і колькі-ж трэба волі,
як нястомна наша юнь!
...А заходзь, заходзь араці
яшчэ й ты, Андрэю Джунь.

Трактарам Андрэй заходзіць—
толькі штосьці плуг не так...
Бабы тут затанцавалі:
то святога хвоста-бога,
то святога духу знак!

Ды давай на нас пляваццa,
дакараць і шмат клясці.
...Комсамольцы,—у бясклассе
Шлях напружана масці!

І ад бога і ад пула
за панамі знаеі ўсюды:
веды, тэхніку шукаць
не пускаці бедняка.

Стойце — думаю — са мною
патанцуеце...якраз!
Паспускала рычагі я,
ды й заходжу ў самы раз.

Каму жарты, каму смешкі,
а ў мяне зашмат клапот:
у Керменшчыне аблогі
не араны трыццаць год!

Бабы-ж так: жагнацца, людзі.
Як канчаць, то ўжо канчаць,
дык хапай, ламайце плугі вы —
то-ж анціхры, то-ж анціхры —
то-ж анціхрыста пячаць.

Трактарам я тут хапіла —
бабы й лодыр-дурнап'ян
адсыпнулі, адляцелі,
хто ў калючкі, хто ў бур'ян.

Тут тады яны за мною,
хто з гразёю, хто з глыжом —
накідалі так, што поўна
і на крыллях, і кругом.

А па мне ды ў твар шпурляюць,
ды крычаць: ану-тка, стоп!
Перакручаваць старое?
Ах ты, божа, хвоста-божа,
ды пашлі-ж на іх патоп.

Ад гарэлкі, ад патопу
што таго тупога топу!
Піў-жа пан віно як жар,
насміхаўся з іх у твар.

А я рэжу, а я рэжу,—
што там крыку! Што людзей!..
Джунь за мною заглыбляе,
трактар Яшнага гудзе...

Так было калісь — а зараз
і бабы змяніліся.
Трактар стаў усім за друга —
вось і песня уся.
Як задумалі, так зробім —
Вось і песня уся.
1933.

Пераклаў **П. БРОЎКА.**

Партыйнае жыццё

Разгарнуць дзейсную творчую падрыхтоўку да 25-годдзя вялікага кастрычніка

27 студзеня партарганізацыя Саюза савецкіх пісьменнікаў БССР на сваім адкрытым сходзе абмеркавала пытанне падрыхтоўкі пісьменнікаў Савецкай Беларусі да слаўнай даты — 25-годдзя Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі.

Дастойна сустрэць вялікае свята 25-годдзя Савецкай улады, даць савецкаму народу таленавітыя творы, прасякнутыя пафасам нашай эпохі — эпохі пабудовы комунізма, — творы, услаўляючыя нашы гераічныя дні, адлюстроўваючыя найвялікшыя здабыткі дваццаці пяці год барацьбы і перамог савецкага народа пад вадзіцельствам партыі Леніна—Сталіна, — пачэсны абавязак паэтаў, празаікаў, драматургаў. Стварыць новыя п'есы, оперныя лібрэта, песні і паэмы, раманы і апавяданні —задача пісьменніцкай арганізацыі.

Выступіўшы на сходзе з дакладам аб падрыхтоўцы да 25-годдзя Вялікага Кастрычніка тав. М. Лынькоў падрабязна акрэсліў задачы партыйнай арганізацыі, праўлення і ўсяго Саюза савецкіх пісьменнікаў БССР на бліжэйшы час. Патрэбна пашырыць тэматыку беларускіх пісьменнікаў, — указаў дакладчык. Не знайшла ў літаратуры патрэбнага адлюстравання індустрыялізацыя нашай рэспублікі. Недастаткова паказаны ў літаратуры прамысловасць, рабочы клас, лепшыя людзі вытворчасці—стаханаўцы, калгасная вёска, яе людзі — майстры высокіх ураджаяў, услаўляючыя квітнеючую зямлю нашай рэспублікі. Больш глыбокай распрацоўкі патрабуе і гісторыя Беларусі, выключна багатая высокімі прыкладамі гераізму і мужнасці нашага свабодалюбівага народа. Развіваць і ўзбагачаць усе жанры літаратуры, стварыць выдатнейшыя ўзоры мастацкай творчасці — пярвейшы абавязак кожнага пісьменніка.

Дакладчык даў надзвычай каштоўную прапанову, падтрыманую ўсім сходам, аб стварэнні калектыўнай кнігі аб Савецкай Беларусі. У гэту кнігу павінны ўвайсці мастацкія творы, нарысы, артыкулы вучоных і спецыялістаў. Трэба, каб кніга расказала чытачу аб рэспубліцы — яе багаццях, прыродных асаблівасцях, гарадах, аб росквіце народнай гаспадаркі і культуры беларускага народа.

У спрэчках выступілі пісьменнікі-комуністы М. Клімковіч, К. Крапіва, П. Броўка, М. Модэль. Выступаўшыя ўказвалі на тое, што асновай работы праўлення Саюза пісьменнікаў цяпер павінна з'яўляцца падрыхтоўка да вялікага 25-годдзя. У дзейсную творчую падрыхтоўку да гэтай урачыстасці савецкага народа павінен быць уключан увесь пісьменніцкі калектыў. Трэба дапамагчы ў авалоданні новай тэматыкай пісьменнікам заходніх абласцей БССР. Праўленне саюза абавязана дапамагчы пісьменнікам у вывучэнні жыцця лепшых прадпрыемстваў і калгасаў, у вывучэнні ўзораў сацыялістычнай працы знатных людзей рэспублікі. Пісьменнікі БССР маюць усе сілы, вопыт і для таго, каб дзярзаць у вырашэнні найвялікшай творчай задачы — паказу ў драматургіі, у творах іншых жанраў літаратуры вялікіх вобразаў арганізатараў беларускай дзяржаўнасці, геніяў чалавецтва—Леніна і Сталіна, паказу вобразаў выдатнейшых дзеячоў бальшавіцкай партыі, сапатнікаў Леніна і Сталіна.

Рад пісьменнікаў пачынаюць ужо работу над новымі творамі, прысвечанымі 25-годдзю Кастрычніка. Так, К. Крапіва паведаміў сходу, што ён прыступае к рабоце над п'есай.

Выступаўшыя выказалі думку, што партыйная арганізацыя павінна ў самы бліжэйшы час азнаёміцца з творчымі планамі пісьменнікаў-комуністаў, сістэматычна абмяркоўваць на партыйных сходах не толькі напісаныя творы, але і творчыя планы, чарнавікі работ літаратараў-комуністаў. Праўленне ССП БССР павінна таксама глыбока азнаёміцца з творчымі планамі пісьменнікаў па сустрэчы вялікай гадавіны, дапамагаць пісьменнікам у арыентацыі на найбольш актуальную тэматыку. Многія выступаўшыя на сходзе крытыкавалі Упраўленне па справах мастацтваў пры СНК БССР, якое яшчэ не прыняло ніякіх захадаў па мабілізацыі сіл драматургаў, лібрэтыстаў на напісанне новых твораў для нашых тэатраў — Опернага і драматычных, — твораў, дастойных 25-годдзю Вялікага Кастрычніка.

Па другому пытанню парадку дня — з інфармацыяй аб рабоце мясцкома ССП БССР выступіў тав. Рудзько. Выступаўшыя па інфармацыі тт. Лынькоў, Гусеў, Крапіва, Модэль падвергнулі крытыцы работу мясцкома і грамадскіх арганізацый, у прыватнасці, арганізацыі Асоавіяхіма. Мясцком недастаткова займаецца палітыка-выхаваўчай работай сярод супрацоўнікаў апарата ССП БССР, не наладзіў абароннай работы.

У сваёй пастанове сход партарганізацыі абавязаў мясцком разгарнуць шырокую масава-палітычную і абаронную работу, разгарнуць сацыялістычнае спаборніцтва, дзейсна і штодзённа кантраліраваць у апараце ССП БССР ажыццяўленне Указа Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР аб умацаванні прапоўнай дысцыпліны.

Адкрыты сход партарганізацыі, абмеркаваўшы пытанне падрыхтоўкі пісьменнікаў да 25-годдзя Вялікага Кастрычніка, паклаў пачатак сур'ёзнай і плённатворнай работы пісьменніцкай арганізацыі па падрыхтоўцы да вялікай даты ў жыцці савецкага народа.

А. Б.

Творчы вечар Т. Главацкага

Тэафіль Главацкі, малады польскі паэт, вельмі добра спалучае ў сваіх вершах розныя, на першы погляд, пачаткі. Вось чаму яго творчы вечар, які адбыўся ў беластоцкім Доме пісьменніка 22 студзеня, выклікаў ажыўленую дыскусію па тэарэтычных пытаннях.

Вершы Главацкага напісаны пад выразным уплывам французскіх, а часткова і польскіх, экспрэсіяністаў. Яны з'яўляліся пратэстам супроць афіцыяльнай у апошнія часы б. Польшчы мадэрністычнай школы, да якой належалі Тувім, Вержынскі, Паўлікоўская і інш. Але ўплыў экспрэсіянізма на паэзію Главацкага ні ў якім разе не вычэрпвае пытання аб характары яго творчасці. Экспрэсіянізм дае яму чыста маляўнічыя эфекты: пейзаж, каларыт, маляўнічыя плямы, як у вершах «Свята», «Мітынг». Адначасова Главацкі, не спыняючыся на зрокавых успрыняццях, дамагаецца гучных гукавых злучэнняў. Фанетыка яго паэзіі, спалучэнне асобных літар ствараюць побач з маляўнічым вобразам—вобраз акустычны, слыхавы. Я маю тут на ўвазе «Мітынг» і «Свіцязь».

Аднэй з галін, бадай найбліжэйшай паэту, з'яўляецца грамадская сатыра. Сведчыць аб гэтым з размахам, з энтузіязмам напісаныя творы «Быдла», «Пан прэзідэнт». Грамадскія матывы, бунт супроць капіталізма мацней выступаюць іменна ў сатырычных вершах Главацкага.

Трэцім складнікам паэзіі Главацкага з'яўляецца лірызм. Глыбока адчутыя вобразы, арыгінальныя параўнанні паэт спалучае ў сваіх лірычных вершах з класічнай пабудовай страфы.

Тэафіль Главацкі—паэт малады; сведчыць аб гэтым запал, энтузіязм і размах яго вершаў. Тым больш трэба падкрэсліць высокі ўзровень яго паэзіі, дасканалае веданне ім мовы, мэтаімкнёнасць і пластычнасць словазлучэнняў,—як гукавую, так і маляўнічую. Далейшая праца ў савецкіх умовах, ва ўмовах творчай свабоды, разаўе і ўмацуе талент паэта.

У абмеркаванні творчасці Главацкага бралі ўдзел т. т. Б. Мірк, Ю. Равіч, Г. Дабжынская, В. Найдус, Ражноўскі і інш.

Елена Сэльм.

Беласток.

Беларускія мастакі рыхтуюцца да выстаўкі „Наша радзіма“

Беларускія мастакі разам з мастакамі ўсяго Совецкага Саюза рыхтуюцца да значнай падзеі ў іх творчым жыцці. У 1942 годзе ў Маскве, у гонар 25-годдзя Вялікай Кастрычніцкай соцыялістычнай рэволюцыі, адкрываецца Ўсесаюзная выстаўка «Наша радзіма», на якой будуць прадстаўлены лепшыя дасягненні совецкага выяўленчага мастацтва. Адначасова ў БССР адкрыецца рэспубліканская мастацкая выстаўка.

Адзін толькі пералік тэм, узятых мастакамі, сведчыць аб мэтанакіраванасці і незвычайнай змястоўнасці работ, рыхтуемых мастакамі БССР для выставак 1942 года. Вось некаторыя з іх: адкрыццё ў 1525 годзе ў Вільні першай беларускай друкарні і роля ў гэтым беларускага першадрукара Ф. Скарыны; паўстанне беларускіх сялян пад кіраўніцтвам Налівайкі ў Магілеве супроць феадалаў (падзея адносіцца да 1595—1596 год); расправа віцебскіх гаражан з уніятам Кунцэвічам (1623 год); вызваленчая барацьба беларускага і украінскага народаў супроць польскіх паноў (1648—1654 годы), — у гэтай тэме фігурыруюць саратнікі Багдана Хмяльніцкага (Небаба і інш.), абараняўшыя Мазыр ад панскіх войск.

Перад гледачом ажывуць карціны гераічнага мінулага беларускага народа, напрыклад: бітва рускіх са шведамі ў 1668 годзе каля вёскі Лясной (Прапойскі раён), калі рускім войскам значную дапамогу аказалі стыхійна ўзнікшыя беларускія атрады сялян і рамеснікаў, разгром напалеонаўскіх войск ля Бярэзіны ў 1812 годзе пры дапамозе беларускіх партызанаў.

Жывапісцы, скульптары і графікі пакажуць у сваіх работах слаўныя даты з гісторыі рэволюцыйнага руху на Беларусі ад часоў барацьбы Кастуся Каліноўскага да нашых дзён. Будуць адлюстраваны: забастоўка рабочых Беластока ў 1877 годзе; I з'езд РСДРП у Мінску ў 1898 годзе; стачка гомельскіх чыгуначнікаў ў 1899 годзе; Беластоцкі совет рабочых дэпутатаў (студзень 1905 года); галадоўка палітвязняў у Мінскай турме (1909 год) і г. д.

Вялікі Кастрычнік на Беларусі мастакі ўвасобяць у такіх тэмах, як прабыванне М. В. Фрунзе ў Мінску, раззбраенне стаўкі Духоніна ў Магілеве. I з'езд КП(б)Б у Смаленску, партызанскі рух на Беларусі (матрос Блажко, дзед Талаш і інш.), гутаркі Калініна з сялянамі ў Самахвалавічах (чэрвень 1919 года), Серго Орджанікідзе ў разведцы пад Барысавам, бал за Мінск.

Асобнае месца будзе адведзена барацьбе беларускага народа пад кіраўніцтвам комуністычнай партыі за адбудаванне гаспадаркі рэспублікі, разбуранай імперыялістычнай і грамадзянскай войнамі. У раздзелах: «Разгорнутае гаспадарчае і культурнае будаўніцтва ў рэспубліцы», «Перамога соцыялізма і Сталінская Канстытуцыя» і інш. Пройдуць такія тэмы, як будаўніцтва Гомсельмаша, шклозавода імя Сталіна, Магілеўскай шоўкавай фабрыкі, прывітанне беларускага народа Чадзвычайнаму VIII Усесаюзнаму З'езду Советаў, дэкада беларускага мастацтва ў Маскве і г. д. На выстаўках 1942 года будзе паказана галерэя знатных людзей рэспублікі.

Беларускія мастакі маюць магчымасць усебакова разгарнуць свае творчыя сілы, каб сродкамі жывапісу, скульптуры і графікі паказаць гледачу гераічны шлях, пройдзены совецкім народам у барацьбе за вялікія ідэі Леніна—Сталіна.

Падрыхтоўцы мастакоў да выставак 1942 года дапаможа план творчых мерапрыемстваў Саюза совецкіх мастакоў БССР на 1941 год. У гэтым плане прадугледжаны творчыя камандыроўкі і экскурсіі мастакоў у Маскву, на Украіну і ў Грузію для абмену вопытам, рад лекцый і кансультацый па асобных тэмах і інш. Значнай дапамогай з'явіцца і арганізуемыя ў 1941 годзе персанальныя, групавыя і абласныя выстаўкі.

У студзені былі адкрыты абласная выстаўка мастакоў у Віцебску і персанальная выстаўка тэатральнага мастака О. П. Марыкса ў Мінску. У бліжэйшыя 2—3 месяцы ў Мінску будуць арганізаваны персанальныя выстаўкі мастакоў Е. Красоўскага (Мінск), Л. Лейтмана (Віцебск) і С. Юдовіна (Ленінград). У лютым рад мінскіх мастакоў прыме ўдзел у абароннай выстаўцы ў Маскве. Да дня 8 сакавіка ў мінскім Доме мастака арганізуецца групавая выстаўка жанчын-мастачак: Ізергінай, Дакальскай, Галоўчанка, Лі, Здаоўскай, Генінай і Галубок. У красавіку філіяламі Саюза мастакоў у Брэсце і Беластоку будуць праведзены групавыя справаздачныя выстаўкі мясцовых мастакоў. Персанальная выстаўка аднаго з лепшых графікаў тав. Юдовіна будзе ў маі перанесена з Мінска ў Віцебск і Беласток. У гэты-ж перыяд мяркуецца арганізацыя выстаўкі графікаў заходніх абласцей БССР у Маскве. Абласныя выстаўкі мастакоў у Брэсце, Гомелі, Беластоку будуць прысвечаны 24-й гадавіне Вялікага Кастрычніка. У Мінску ў дні кастрычніцкіх святаў будзе арганізавана справаздачная асенняя выстаўка мясцовых мастакоў. У Віцебску, апрача работ Юдовіна, будуць паказаны рысункі засл. дзеяча мастацтваў БССР А. Бразэра. У канцы 1941 года ў мінскім Доме мастака будзе праведзена групавая выстаўка мастакоў П. Гаўрыленкі, Е. Ціхановіча і А. Давідовіча і персанальная выстаўка мастака-пейзажыста В. Кудрэвіча. У Магілеве мяркуецца групавая выстаўка мастака-ордэнаносца М. Манасзона, скульптара А. Жорава і мясцовых мастакоў К. Гедды, В. Берзіна і Н. Пархоменкі.

Гэта далёка не поўны пералік творчых мерапрыемстваў Саюза мастакоў, накіраваных да ўзняцця ідэйна-палітычнага і прафесіянальнага ўзроўню мастакоў БССР. Хваля творчага спаборніцтва ў гонар надыходзячай XVIII Усесаюзнай партыйнай канферэнцыі, якая ахапіла ўвесь совецкі народ, выклікала небывалы ўздым і сярод мастакоў, якія актыўна рыхтуюцца да выставак 1942 года. Няма сумнення, што мерапрыемствы Саюза мастакоў па арганізацыі персанальных, групавых і абласных выставак, дапамога ў арганізацыі творчага спаборніцтва паміж мастакамі, выкарыстанне багатага вопыту выстаўкі «Ленін і Сталін — арганізатары БССР» забяспечаць беларускім мастакам адно з вядучых месц на выстаўцы «Наша радзіма», якая з'явіцца Ўсесаюзным аглядам дасягненняў выяўленчага мастацтва за 25 год Совецкай улады.

І. РУБІНШТЭЙН.



Двойчы Герой Совецкага Саюза **Грыцавец.** Фрагмент помніка работы заслужанага дзеяча мастацтваў БССР скульптара-ордэнаносца **А. Грубэ.** Экспаніруецца на Ўсесаюзнай мастацкай выстаўцы «Абарона СССР».

Фота І. Каплінскага

Развіваць мастацтва пейзажу

(Заметкі мастака)

Мастакі Совецкай Беларусі, як паказвае выстаўка «Ленін і Сталін—арганізатары БССР», плодатворна працуюць над вырашэннем важнейшай творчай задачы—над стварэннем тэматычнай карціны з глыбокім раскрыццём зместу. Выстаўка паказвае і яшчэ адну надзвычай важную акалічнасць: наяўнасць рознавіднасці манер рэалістычнай школы, што сведчыць аб невычарпальных творчых магчымасцях для розных мастацкіх індывідуальнасцей.

Я спынюся на пытаннях пейзажу.

Тэма беларускага пейзажу, велізарная і шырокая, нажаль, толькі закранута на выстаўцы. Пейзаж у большасці выпадкаў з'ўляецца толькі фонам карціны. Таму пытанне аб беларускім пейзажы, як тэматычнай карціне, цяпер устае перад мастакамі-пейзажыстамі на ўвесь свой рост. Нельга ўжо здавальняцца эцюдам, эскізам, накідам. Гэта, аднак, не значыць, што трэба кінуць усю чарнавую, збіральную работу, як падрыхтоўчы матэрыял для стварэння сінтэтычнага пейзажу-карціны. Патрэбна сапраўдная барацьба за пейзаж-карціну шляхам глыбокага вывучэння прыроды. Совецкі пейзаж — гэта глыбокае выражэнне любві мастака да роднай прыроды, да совецкага народа — гаспадара жыцця, соцыялістычна перарабляючага прыроду. І роля чалавека ў совецкім пейзажы велізарная.

Пейзаж Беларусі багат шырокімі прасторамі палёў, шумлівымі лясамі, прыгожымі азёрамі, рэкамі, узгоркамі і далінамі.

З'явілася новае цудоўнае харастве гарадскога пейзажу, абумоўленае соцыялістычным росквітам нашай краіны. Квітнее калгасная зямля багатымі ўраджаямі хлеба, ільну, бульбы, фруктаў, гароднiны. І задача совецкага мастака — праўдзіва, з вялікім пачуццём новага ў змесце і форме перадаць у сваёй творчасці гэта новае цудоўнае хараство совецкай зямлі ў пейзажы-карціне.

Некалькі заўваг аб асобных пейзажах, прадстаўленых на выстаўцы.

Нашу ўвагу перш за ўсё спыняюць работы А. Шэўчэнкі, якія паказваюць правільнае разуменне мастаком жывапісных задач пейзажу — работы колерам. Яго пейзаж «Сенакос» паказальны і ў пабудове кампазіцыі, якая ставіць вехі к вялікай тэматычнай карціне. У пейзажы шмат яшчэ сырога, нематэрыяльнага, ёсць месцы, дзе колер падмяняецца фарбай, месцы, дзе глуха-чорна, але гэты твор паказвае, што мастак на правільным шляху.

Вялікай увагі заслугоўваюць і творы старэйшых пейзажыстаў — В. Кудрэвіча і Н. Дучыца. У іх шмат вопыту, назіранняў. Але песняроў беларускай прыроды хочацца бачыць ва ўсім творчым бляску.


Кудрэвіч даў тэматычную карціну — індустрыяльны пейзаж «Белдрэс». Замысел новы: паказаць панараму заваяванняў чалавекам-творцом дрыгвы, торфабалот, неабсяжных прастораў Беларусі. Але мастак, узяўшы гераічную тэму, пакуль не справіўся з задачай. Кудрэвіч не здолеў знайсці гучнасці фарбаў, не адухатварыў палатно страсцю творца, каб паказаць сімфонію радасці і ўрачыстасці пакарэння прыроды. Выйшла некалькі бясколерная, не актыўная рэч.

Калі Кудрэвіч лірык, дык Дучыц — эпік. Старанна адбіраючы матэрыял, Дучыц таксама прышоў да тэматычнага пейзажу «Вялікі гідраторф». Але мастак не ўзбагаціў натуру сілай свайго выбражэння. Атрымалася павелічэнне эцюда: не сінтэтычная карціна-кампазіцыя, а частка, кавалак вялікай работы-карціны. Па колеру яна чорная. Гэта ў пэўнай ступені ўласціва і эцюдам «Дарога ў лесе»», «Ссечаны лес», «Лес» і інш. Дарэчы, у гэтых работах заўважаецца і натуралістычная тэндэнцыя.

Хібы ва ўказаных намі творах ва многім характэрны і для работ раду іншых пейзажыстаў, у прыватнасці маладых. Задача ўсіх нашых пейзажыстаў адна: больш глыбока вывучаць жыццё, хараство роднай зямлі і настойліва ўдасканальваць сваё майстэрства, сваю жывапісную культуру.

Нік. ТАРАСІКАЎ.





«Прывіды» Г. Ібсена ў Віцебскім Дзяржаўным драматычным тэатры. Злева — сцэна спектакля. У ролі Освальда — народны артыст БССР, ордэнаносец **П. С. Малчанаў,** у ролі фру Альвінг — артыстка **Л. І. Мазалеўская;** справа — Малчанаў-Освальд.

Фота А. Галашава.

Пачуццё часу

★

С. Гершэнзон

★

Серафіма Бірман нядаўна расказала аб адным выразе І. М. Масквіна.

«—...Іграць па-сапраўднаму, — неяк выпадкам кінуў мысль Іван Міхайлавіч, — можна толькі тады, калі аўтар знойдзе ў тваёй душы (у душы актора) радзіму...»

Запомнім гэты выраз! Ён многае растлумачыць. Калі аўтар, правільней, мыслі і пачуцці аўтара знойдуць сабе радзіму ў душы актора, г. зн. стануць роднымі для актора, тады і словы аўтара будуць роднымі не толькі актору, але і гледачу. Гэта глыбокая заўвага адносіцца ў роўнай ступені як да сучасных аўтараў, так і да класікаў. Асабліва да класікаў, чые творы аддалены ад нас стагоддзямі. І калі актор душой адчувае твор аўтара, ён робіцца ўладаром умення знаходзіць у творах мінулага тое, што хвалюе нас і сёння, што робіць Шэкспіра і Лопе дэ-Вега, Мальера і Гальдоні, Гогаля і Грыбаедава, Пушкіна і Лермантава, Остроўскага і Сухава-Кабыліна, Талстога і Чэхава нашымі саюзнікамі ў барацьбе за шчаслівага, мужнага і моцнага чалавека, што робіць іх нашымі сучаснікамі.

Сапраўднае мастацтва, адначасова карціны мінулага, напаўняючы жывымі фарбамі і вобразамі старонкі мінулага жыцця, аддаленага ад нас часам, ніколі не павінна абмяжоўваць сваю задачу рэстаўратарствам. Сапраўдны мастак — не рэстаўратар, не музейны капіїст! Уменне ў мастацкім творы мінулага разгледзець і раскрыць агульначалавечы сэнс, той сэнс, які хвалюе і сучаснага гледача, робіць класічны твор мастацтва фактам сучаснага жыцця.

Сакрэт гэтага ўмення знаходзіцца ў руках мастака, які валодае пачуццём часу. Уменне раскрываць «сучаснасць» класікаў—і ёсць невянучая сіла і абаянне ўсякага вялікага таленту. Мы заўсёды ўдзячны мастаку, які ўмее ў творы класіка знаходзіць ноты, сугучныя нашаму сёння, і, кіруемы гэтымі нотамі, іграць на струнах чалавечага сэрца, пакараючы яго сілай свайго таленту.

Такім мастаком з'ўляецца народны артыст БССР П. С. Малчанаў. У найцяжэйшай ролі сусветнай драматургіі, у ролі Освальда, Малчанаў знаходзіць тое жыццёвае і хвалюючае, што робіць Освальда фактам сучаснай рэчаіснасці, — рэчаіснасці, якая існуе па другі бок нашай граніцы. Ненавідзячы гэты свет да глыбіні душы, Малчанаў і ўвасабляе ў сабе трагедыйны вобраз велічнай патэтыкі Ібсена. Сілай незвычайнага дараванння Малчанаў, актор вострай мыслі і глыбокага пачуцця, пранікае ў самае сэрца ібсенаўскага генія, у самую душу п'есы «Прывіды». Сілай свайго таленту Малчанаў прымушае нас ненавідзець рэчаіснасць, якая прывяла чалавека да гібелі.

Шчыра кажучы, мы з вялікай баязню ішлі на спектакль. Што захапляе Малчанава у ролі Освальда? Эцюд паталагічнасці, так часта іграны на сцэне? Можа, эцюд асуджанасці чалавека, які спакусіў многіх актораў? А ў якой меры цікава гэта совецкаму гледачу?

Малчанаў развязвае ўвесь вузел нашых сумненняў. Освальд,—гаворыць ён сваёй ігрой,—хвалюе нас таму, што гэта —афяра буржуазнага свету, які ўзаконіў прастытуцыю, асудзіў чалавека на смерць. Як таленавіты мастак, Освальд імкнецца на палотнах сваіх паказаць радасць жыцця, хараство прыроды. Але цяжкая хвароба, якую атрымаў ён у спадчыну ад бяспутнага бацькі, скавала яго сілы. Освальд прагне жыцця, але асуджан на смерць! Жыць! У што-б там ні стала жыць! Сонца! З якім гневам гаворыць ён: «За ўсе мае прыезды дадому я не прыпомню, каб хоць раз бачыў тут сонца!» Радасць творчасці вабіць яго. Але з якім болем прызнаецца Освальд, схаваўшы свой твар: «Я ў апошні час мала працую».

Вось тут нараджаецца мысль: калі-б Освальд быў здаровым, ён прынёс-бы не мала радасці чалавеку.

Самае страшэннае заключаецца ў тым, што Освальд ведае аб сваёй немінучай гібелі, аб падсцерагаючай яго хваробе. Ведае, але не верыць. Правільней, не хоча верыць. Нейкая затоеная надзея жыве ў ім. Вось ён рашыўся сказаць маці аб сваім няшчасці. Але, расказаўшы аб усім, Освальд—Малчанаў не столькі скардзіцца, колькі падрыхтоўвае маці. Навошта? Можа, ён беражэ маці? Чаго-ж ён хоча? На што спадзяецца? І раптам, нібы ўджалены: «Мама, у Рэгіне ўвесь мой ратунак!» Што гэта? Роспач чалавека, які прагне асалоды кахання? Не, гэта яшчэ адна надзея. Магчыма, жыццё з Рэгінай зменіць многае, хоць-бы адцягне пагражаючую катастрофу.

Адчайнае змаганне за жыццё! Але смерць, якая падсцерагае яго, няўмольная. Освальд разумее гэта. Ды і жыццё адвярнулася ад яго. Ледзь ухопіцца ён за надзею-саломінку, як і тую вырываюць з рук. Апошняй надзеяй было каханне да Рэгіны. Але аказалася, што Рэгіна—яго сястра. Тым не менш прагнасць да жыцця ў ім неўміручая. Жыць да апошняй мінуты свядомасці! Ён знаходзіць у сабе сілы прасіць маці падаць яму атруту тады, калі яго вар'яцтва зробіцца неабвяргальным фактам.

Прагнасць жыцця перамагае асуджанасць! І тут нараджаецца пачуццё нянавісці да тых, хто загубіў гэта маладое жыццё.

Малчанаў ведае сапраўдную трагедыю Освальда. Вось ён паяўляецца з пажару, увесь попельны, нібы разам з домам згарэў і ён. Так, Освальд разумее, што ён згарыць, увесь згарыць. Нішто ўжо не выратуе яго. Сонца, творчасць, радасць жыцця, якіх ён так прагнуў, закрыты для яго. Але няўжо зацменне? Канец? Мысленна ён усё-ж змагаецца. Освальд мітусіцца па пакоі, вакол стала, не знаходзіць месца. Але вось ён супакоіўся: сеў за раяль. І музыка супакоіла ўзбуджаны мозг.

— Мама, дай мне сонца, — гаворыць да акна. Праз момант ён паварачваецца ўсім корпусам да гледача, рукі бездапаможна павіснулі, галава неяк глыбока ўвайшла ў плечы і два мёртвых вокі застыглі ў вар'яцкай нерухомасці...

— Сонца, — ледзь кратаюцца яго вусны. І нараджаецца боль у сэрцы. Боль, узнікшы ад гарачага пачуцця нянавісці і жалю. Заўважым, — Малчанаў не карыстаецца якімі-небудзь эфектамі знешняга характару. Ён не захапляецца хваравітасцю Освальда. Гэта толькі фон. А сутнасць не ў гэтым.

Освальд толькі факт разыграўшайся трагедыі. У чым-жа сутнасць трагедыі? На гэта Освальд не адказвае, ды і адказаць не можа. Ён кідае промень святла ў цёмнае царства ханжаства і крывадушнасці пастара Мандэрса, ён падкрэслівае трагедыю жыцця Фру Альвінг, якая прадала сябе за грошы, выйшла замуж без кахання. Дзякуючы Освальду — Малчанаву многія патайныя куткі драмы прасвятляюцца. Дасягае ён гэтага двума асаблівасцямі.

Па-першае, ён стварыў вобраз. Мы часта ўжываем гэты выраз, але не заўсёды аддаем сабе адчот у яго сутнасці. Часам даволі актору знайсці рад цікавых месц у выкананні той альбо іншай ролі, як мы спяшаемся з вывадам: «стварыў вобраз». Малчанаў пераканаў нас, што стварыць вобраз азначае знайсці, галоўным чынам, пачуццё цэлага, адзінага, якое звязвае разрозненыя карціны, сцэны ў адно звязнае.

Па-другое, Малчанаў не толькі стварыў вобраз, — ён даў жыццё вобразу. Освальд дадзен Малчанавым у руху, у развіцці і змяненні. Кожны раз узнікае нешта новае, а старое адмірае.

Освальд шукае вырашэння, — вось як хочацца акрэсліць сутнасць першага акта. Спускаючыся з лесвіцы, якая вядзе ў гасціную, у лёгкім паліто, з капелюшом у руцэ, курачы доўгую люльку, Освальд змрочны, сабраны, усе мыслі яго сканцэнтраваны на адным: што-ж рабіць? Як абыйсці смяротную небяспеку?

Калі ў першым акце Освальд — Малчанаў шукае вырашэння, то ў другім ён на нешта рашыўся. Ён рашыўся паспавядацца перад маццераю. Пажар спаліў усе яго надзеі. Трэці акт напоўнен актарам велічнай сілай. «Мама, дай мне сонца» — гучыць абвінавачаннем для тых, хто асуджае чалавека на смерць.

Вернемся, аднак, да фру Альвінг, да галоўнай гераіні «Прывідаў», бо ў цэнтры п'есы не Освальд, а фру Альвінг, жанчына, якая стала афярай свету залатога кашалька, дзе ўсё прадаецца: і каханне, і чэсць, і сям'я, і свабода чалавека. Выходзячы замуж па разліку за камергера Альвінга, фру Альвінг вельмі позна ўсвядоміла сваю памылку. А ўсвядоміўшы яе, не мела сілы вырвацца з моцных лап грамадскай крывадушнасці. На варце буржуазнай маралі — законы дзяржавы, рэлігія, грамадская думка. Ледзь толькі фру Альвінг паспрабавала вырвацца з моцных лап звязваўшага яе шлюбу, як зараз-жа яе вярнулі на ранейшае месца. Пастар Мандэрс, да якога яна ўцякла, вярнуў яе назад, упэўніўшы, што жонка «павінна пакорна несці крыж, ускладзены на яе «вышэйшай воляй», што жонка «не пастаўлена суддзёй над мужам». Толькі вярнуўшыся дадому, фру Альвінг усвядоміла ўсю бязглуздасць і бяссэнснасць яе спроб вызваліцца ад прыгнятаючага ярма ілжы і крывадушнасці. Перад ёю ўсталі «прывіды», якіх яна не мае сіл перамагчы. «У нас,—гаворыць фру Альвінг,—праяўляецца не толькі тое, што перайшло да нас у спадчыну ад бацькі з маткай, але даюць сябе адчуваць і ўсякія старыя, аджыўшыя правілы, вераванні і таму падобнае. Усё гэта ўжо не жыве ў нас жывым жыццём, але ўсё-ж сядзіць моцна, і нам не зжыць яго... Уся краіна поўна такіх прывідаў; яны незлічоны, як пясок марскі».

Сапраўдная гераіня п'есы—Фру Альвінг. У Віцебскім тэатры Фру Альвінг не стала ў цэнтры спектакля. Не стала не толькі таму, што гэтага не адчула выканальніца ролі, артыстка Мазалеўская. Не стала, галоўным чынам, таму, што не знайшлося ў спектаклі кіруючай рукі рэжысёра. Малчанаву дапамагло пачуццё часу. Пастаноўшчык-жа Гарбуноў не адчуў пачуцця новага, затушаваў, прыглушыў ідэйны замысел Ібсена. Не зразумеўшы ідэйнага замыслу Ібсена і асаблівасцей яго драматычнага пяра, Гарбуноў не здолеў удыхнуць у спектакль жыццё, якое напоўніла-б крывёю і плоццю кожны вобраз.

Успомнім, што «Прывіды» напісаны ў тую пару, калі Ібсен выступаў як страсны абвініцель буржуазнага свету, свету ілжы і несправядлівасці, калі ён бязлітаснай рукой зрываў маскі з буржуазнага шлюбу, бічаваў крывадушную мараль буржуазіі і падкапваўся пад самыя асновы капіталістычнага грамадства. У часе стварэння «Прывідаў» Ібсен быў чалавекам, які аддаваў усе свае сілы стварэнню ідэйна высокага тэатральнага мастацтва. Ён сам гаварыў: «Мы, драматургі, павінны імкнуцца к таму, каб шляхам нашай творчасці палепшыць існуючы светапарадак». Успомнім, якую буру абурэння выклікалі «Прывіды» у буржуазным грамадстве. Ні адна з яго п'ес не выклікала такога пратэсту, нават «Стаўпы грамадства». А між тым уражанне, створанае гэтай п'есай, параўноўвалі з тым узбуджэннем, якое ў свой час выклікала паяўленне «Каварства і любві» Ф. Шылера.

Рэжысёр не зразумеў сілы гэтай ідэйнасці, не знайшоў мэты, вакол якой аб'еднаў-бы імкненне ўсіх актораў. У выніку кожны актор аказаўся сам сабе рэжысёрам.

Крывадушны пастар-ханжа Мандэрс—прадстаўнік грамадства, вінаватага ў трагедыі Фру Альвінг, у гібелі яе сына, у трагедыі Освальда,—у выкананні артыста Валынчыка—чалавек наіўны, мяккі, вучоны прастафіля, якога водзіць за нос спрактыкаваны нягоднік—сталяр Энгстранд. Артыст Вялікі вельмі аголена, часам нават прымітыўна раскрывае вобраз сталяра. Такое тлумачэнне выклікала неўразуменне: як-жа не заўважаюць гэтага Фру Альвінг і пастар? Маладая артыстка Маркоўская пакуль што шукае шлях-сцежку да Рэгіны. І калі-б не было ў спектаклі Малчанава, тэатру прышлося-б прызнаць, што ібсенаўскі арэпак не для яго зубоў.

Толькі ў душы аднаго актора аўтар знайшоў радзіму. Мыслі і пачуцці аўтара сталі роднымі актору, а праз яго і гледачу. Мы гаворым аб Малчанаву. У душы другога аўтар знайшоў, па трапнаму выразу Серафімы Бірман, толькі гасцініцу: усё адно, хто прытуліцца там на вечар спектакля. Мы маем на ўвазе рэжысёра Гарбунова.

Дзве камедыі

„Хто смяецца апошнім“ і „Слуга двух паноў“ у Пінскім тэатры

Гарлахвацкі ў часе сваёй гутаркі з сакратаром парткома, гаворачы аб неабходнасці ачысткі ўстановы ад варожых людзей, гідліва збівае пстрычкай парушынку з свайго пінжака. Ледзь прыкметная дэталь, але як выразна выдае яна ў актору ўдумлівасць, імкненне знайсці псіхалагічнае апраўданне кожнаму руху свайго персанажа!

Прайдзісвет Гарлахвацкі гаворыць аб ворагах, а думае перш за ўсё аб сабе, аб небяспецы, што навісла над уласнай галавой. Каб адвесці гэтую небяспеку, трэба збіваць з тропу другіх, трэба больш за ўсіх крычаць аб пільнасці. Неабходна напускная поза, паказны жэст. А Гарлахвацкі — майстар позы. Як толькі зайшла гаворка аб ачыстцы апарата, ён ужо ачышчаецца, ужо пярэбіць сваё пер'е, прыхарашваецца, як верабей на сметніку.

Тут вельмі лёгка збіцца на шарж, страціць меру, але С. Бульчык, які выконвае ролю Гарлахвацкага, — актор вялікай дысцыпліны. Кожны рух, кожная дэталь у яго арганічна залежны ад пачуцця, падначалены пэўнаму замыслу. Гэта — шлях сапраўднага мастака.

З першага свайго паяўлення на сцэне Бульчык некалькімі штрыхамі прыцягвае ўвагу да вобраза, сэнс якога яшчэ невядомы для гледача, але ён ужо адчуў яго патэнцыю і з напружаннем будзе сачыць за кожным учынкам, словам Гарлахвацкага, таму што гэта не гатовая схема, а жывы, хітры драпежнік і выкрыць яго ў жыцці цяжэй, чым на сцэне. Бульчык гэта не толькі разумее, але і даводзіць сваёй пераканаўчай, таленавітай ігрой.

Жывое, непасрэднае ўзаемадачыненне з гледачом, поўная ўнутраная свабода — вось чым захапляе Бульчык. Гэтыя якасці асабліва ярка, з сапраўдным бляскам выявіў актор у спектаклі «Слуга двух паноў» у ролі Труфальдзіно.

Яго Труфальдзіно выходзіць з вузкіх рамак улюбёнага персанажа традыцыйнай італьянскай камедыі. Ён жыве на сцэне, як адвечны весельчак і балагур, хітры, вынаходлівы, умеючы бачыць ва ўсім толькі ўцеху, толькі радасць і ўласцівы не толькі аднаму пэўнаму веку і нацыі.

Італьянская камедыя часта праваціруе актора ўяўнай лёгкасцю. Яму здаецца, што каляровы плашч і шпага ўжо самі іграюць. Такое ўяўленне і прыводзіць да таго, што сядзіш у тэатры і замест спектакля бачыш перад сабою вясёлую мітусню варон, увабраўшыхся ў паўлінавае пер'е.

Красачнасць, тэатральная ўрачыстасць ігры Бульчыка суцэльны з тыпічнасцю, яны яшчэ выразней падкрэсліваюць жыццёвасць характару. Бульчык — актор самых разнастайных увасабленняў. Дыяпазон яго магчымасцей вельмі шырокі. Ролі Гарлахвацкага і Труфальдзіно выдаюць у ім сур'ёзнага майстра, які ўпарта шукае ўласнага шляху. Яркая дэталь, характэрны штрых, выразнасць кожнага жэсту, кожнага слова, — усё гэта знаходзіць у Бульчыка сваё абагульненне. Актор шукае такой дэталі, якая-б дапамагла яму раскрыць пэўную мысль, пэўнае пачуццё.

За дэталь «іграву», абы апраўдаць сваю прысутнасць на сцэне, можа хапацца толькі той, хто яшчэ не мае свайго густу, сваіх адносін да вобраза.

У «Хто смяецца апошнім» дворнік Нічыпар у карыдоры навуковай установы сустракаецца з прыбіральшчыцай цёцяй Кацяй, каб абмеркаваць навіны. Актору Ф. Бутвілоўскаму, выконваючаму Нічыпара, хочацца ігры, дзеі, жэсту. Што можна знайсці? Вядома, — што бліжэй, што пад рукамі. Нічыпар дастае папяросу, запалкі, закурвае. А, закурыўшы, запалку кідае... на падлогу, якую толькі-што і пры ім старанна націрала цёця Кася. Так адна неразумная дэталь загубіла, разбурыла цэлы вобраз. Мы ўжо не верым, што перад намі блюсціцель чыстаты, які гатоў чужы акурак падняць, каб толькі падкрэсліць сваю ўладу, свае права над неахайнымі людзьмі, што не паважаюць чужой працы.

Актор у даным выпадку і на хвіліну не падумаў, што такую апрыкралую трафарэтную «дробязь» і якраз у такой ролі трэба сапраўды «абыграць», знайсці ёй месца. Тав. Бутвілоўскі-ж наіўна ўпэўнен, што досыць яму доўгай барады, фартуха і бляхі, каб стварыць вобраз.

Адзначаючы ў «Хто смяецца апошнім» вялікія акторскія ўдачы, як Зёлкін — А. Ефрэменка, Зёлкіна — Т. Зорына, жонка Гарлахвацкага — Е. Абрашкевіч, Туляга—Г. Шыкавец, нельга прымірыцца з той мяжой, якая рэзка аддзяляе ад моцных, пераканаўчых адмоўных персанажаў амаль усе вобразы станоўчых герояў, якія выглядаюць у спектаклі невыразнымі і даволі прымітывізіраванымі.

Калі арт. Ю. Гальперына імкнецца надзяліць Веру чалавечай цеплынёй, знайсці ўласцівыя ёй рысы, то артыст А. Дашкоўскі ўсю ролю сакратара парткома зводзіць да нейкага «разумнага лукаўства». Левановіч глядзіць на людзей толькі як на аргументы гатовых, яму аднаму вядомых ісцін. Панібрацкае пахлопванне па плячу ўсіх, нават старэйшых за яго, падміргванне, стэрэатыпная падбадзёрваючая рэпліка «ну, ну» — вось «стыль» Левановіча ў выкананні Дашкоўскага.

Вельмі аднастайны Чарнавус — арт. І. Кунцэвіч. Занадта ён разгублены, падаўлены, пасіўны. Актор, не шкадуючы адной фарбы, ігнарыруе ўсе астатнія, якімі можна было-б больш поўна перадаць вобраз сумленнага совецкага прафесара, абняслаўленага ворагамі.

Яўна парушае цэласнасць удалага, пераканаўчага спектакля (пастаноўка П. Данілава) апошняя сцэна, сцэна разаблачэння Гарлахвацкага. Але ў гэтым больш вінен ужо рэжысёр, чым выканаўцы. Сцэна гэта вельмі-ж статычная, спакойная. Гарлахвацкі чытае сваё «даследванне» аб «свінячым мамантце», нясе несусветную бязглуздзіцу, прысутныя-ж прафесары, навуковыя работнікі сядзяць з такімі бясстраснымі тварамі, быццам прышлі яны адбыць павіннасць. Зрэдку перашэптваюцца, пазяхаюць і, як па падказцы суфлера, кідаюць рэплікі. Выканаўцы нібы зусім забыліся пра гледача, якому ўжо амаль усё вядома — і што «працу» Гарлахвацкаму напісаў Туляга, і што ўсе сабраліся на апошнюю вочную стаўку прахадзімца з яго чорным сумленнем, каб уткнуць яго носам у яго-ж злачынства.

Праўда, мастак С. Нечаеў прыдумаў вельмі смешную рэч. Ён намаляваў фантастычнага «свінтуса грандыёзіуса», якога Гарлахвацкі павесіў як ілюстрацыю да свайго даклада. І ў апошнюю хвіліну, калі яшчэ прахвост імкнецца выкруціцца са становішча, Левановіч пераварачвае малюнак і... усе пазнаюць у ім партрэт Гарлахвацкага. Але-ж вынаходлівая выдумка не выратоўвае ўсяе сцэны. У ёй няма напружання, імклівасці, паступовага накаплівання таго магутнага выбуху знішчальнага смеху, якім смяюцца над Гарлахвацкім і Зёлкіным і акторы і глядач.

Найбольш выразны сваім сцэнічным адзінствам, красачнасцю, сапраўднай тэатральнасцю і камедыйнай лёгкасцю спектакль «Слуга двух паноў», пастаўлены К. Саннікавым, аформлены мастаком І. Ушаковым. Апроч бліскучага Труфальдзіно — Бульчыка, у спектаклі выступаюць К. Захарэвіч — Смеральдзіна, А. Ефрэменка — доктар, І. Кір'янаў — Фларындо, Т. Зорына — Кларычэ, Е. Абрашкевіч — Беатрычэ, А. Гвадзёў — купец Панталонэ, Г. Шыкавец — Сільвіо, А. Ошмянскі — насільшчык. Не ўсе ў аднолькавай меры, але кожны з іх спрыяе поспеху спектакля, падтрымлівае яго цэласнасць, агульны замысел, стыль.

Абедзве камедыі — і «Хто смяецца апошнім», і «Слуга двух паноў» — сведчаць аб значным росце, аб сцэнічным удасканаленні маладога абласнога тэатра, аб яго творчай смеласці, упэўненасці і вынаходлівасці.

В. ЦІМСКІ.

Беласток (Наш кар.).

Астроўскі на клубнай сцэне

Драматычны калектыў Мінскага клуба работнікаў медсанпрацы існуе не першы год. У актыве тэатральнага гуртка — «Любоў Яравая» Трэнёва, «Пагранічнікі» Біль-Белацэркоўскага і шмат аднаактных п'ес. Гуртком за мінулы год дадзена звыш дзесяці канцэртаў на прадпрыемствах горада і ў частях гарнізона. Над сваім рэпертуарам гурткоўцы — урачы, медсёстры, студэнты Медыцынскага інстытута — працуюць сур'ёзна і ўдумліва. Аб гэтым сведчыць і новы спектакль «Позняе каханне» А. Астроўскага, паказаны на аглядзе тэатральнай самадзейнасці.

Спектакль «Позняе каханне», пастаўлены пры кансультацыі народнага артыста БССР Г. Глебава, прайшоў з вялікім поспехам. Гледачы пасля спектакля паладзілі авацыю выканаўцам ролей — драматычнаму гуртку клуба медыцынскіх працаўнікоў.

Цікава выканаў ролю Дармідонта студэнт Медыцынскага інстытута С. Кац. Роля гэта адна з складанейшых у п'есе. І трэба адзначыць, што Кац добра зразумеў вобраз Дармідонта. Выконвае ён гэтую ролю проста і непасрэдна, без танных камедыйных трукаў.

Медсястра Е. Рубец, якая каля 20 год удзельнічае ў тэатральных самадзейных гуртках, удала выканала ролю Шаблоўкай — гаспадыні мэбліраваных пакояў. Перад гледачом устае вобраз зборзлівай купчыхі, прагнай, гатовай за грошы афіраваць і сваім сумленнем, і чалавечай годнасцю. Рубец з пачуццём густу і такту выконвае гэту ролю. Шкада толькі, што гэта бясспрэчна здольная выканаўца празмеру захапляецца жэстыкуляцыяй.

Пераканаўчым у ролі Нікалая Шаблова быў В. Панцелят. Трымаўся ён на сцэне ўпэўнена, выразна заносіў тэкст да гледача. Але хацелася-б бачыць на сцэне не вонкавую ігру, а сапраўдныя перажыванні дробнага чыноўніка, страціўшага з прычыны разгульнага жыцця чалавечы маральны вобліk, службовую кар'еру. Нажаль, Шаблоў у выкананні Панцелят атрымаўся крыху сухаватым. Ён не выклікаў у гледача, нават у самых напружаных сцэнах, ні спачування, ні агіды.

Выканаўца ролі Людмілы Герасімаўны Е. Рагавая ў знешняму рысунку не адпавядала сваёму вобразу. Людміла Герасімаўна — гэта пажылая жанчына, якая афіравала сваю маладосць дзеля справу роднага бацькі. Людміла пакахала чалавека. Дзеля яго яна гатова адмовіцца ад бацькі, ад яго спраў. А ў выкананні Рагавой Людміла атрымалася наіўнай маладой дзяўчынай. Глядач ніяк не можа паверыць пазняму каханню Людмілы да Нікалая Шаблова.

Правільна зразумела ролю Лябёдкінай Н. Меншыкава. Лёгкадумная жанчына, якая ззяе ў-свеце чужымі брыльянтамі, жыла з мінулага стагоддзя, загаварыла са сцэны. І глядач уважліва сачыў за паводзінамі Лябёдкінай—Меншыкавай, хітрай і каварнай жанчыны, не грэбуючай нічым для засягнення сваёй мэты. Меншыкава старалася выконваць ролю Лябёдкінай як прафесіянальная актрыса і прынесла на самадзейную сцэну штампы залішне падкрэсленай тэатральнасці. А шкада! Меншыкава мела ўсе магчымасці абыйсціся без штампу, без нарачытай развязнасці на сцэне.

Знешне вельмі добрым быў вобраз адваката Маргарытава ў выкананні Ф. Чыкановіча. Аднак ад выканаўцы можна было чакаць не толькі ўдалага знешняга рысунку, але і добрай ігры. Нажаль, Чыкановіч іграў нароўна. Часамі яго тэкст не даходзіў да гледача, прападаў. У далейшым Чыкановічу трэба звярнуць увагу на дыкцыю.

Спектакль самадзейнага гуртка Мінскага клуба работнікаў медсанпрацы значна выйграў-бы, калі-б лепш было аформлены. Вопраткі многіх выканаўцаў (асабліва Нікалая Шаблова і Дармідонта) не адпавядалі часу п'есе Астроўскага. Нельга не адзначыць і таго, што клуб работнікаў саюза медсанпрацы і ЦК саюза медыцынскіх работнікаў не аддаюць увагі здольнаму тэатральнаму калектыву. Толькі дзякуючы намаганням ініцыятара драматычнай самадзейнасці, студэнта Медыцынскага інстытута П. Петрусенкі гурток не распаўся, а прадаўжае існаваць, хоць у апошні час ён не мае сваёй сталай пляцоўкі.

Тэатральнаму гуртку клуба работнікаў медсанпрацы трэба аказаць дапамогу.


М. АЛЬХОВА,
А. АСТРЭЙКА.

Мастацкая майстэрня ў Ашмянах

У Ашмянах, Вілейскай вобласці, пры райпрамкамбінаце існуе мастацкая майстэрня. У ёй працуюць мастакі-самавучкі. Яны дасягнулі добрых поспехаў у сваёй рабоце. Напрыклад, малады мастак-самавучка А. Маркоўскі піша маслам партрэты, працуе над кампазіцыямі на тэмы «Абарона граніцы», «Сустрэча Чырвонай Арміі ў часе вызвалення народаў Заходняй Украіны і Заходняй Беларусі», «Грамадзянская вайна» і інш.

Але трэба сказаць, што дырэктар райпрамкамбіната тав. Рабушэнка і загадчык майстэрняй тав. Кудрашоў мала клапоцяцца аб стварэнні спрыяючых умоў для работы маладога і здольнага калектыва мастакоў.

А. БЕЗМЕН.



Агляд тэатральнай самадзейнасці БССР. На здымках: 1) Сцэна з спектакля «Позняе каханне» А. Астроўскага ў пастаноўцы драмгуртка Мінскага клуба саюза работнікаў медсанпрацы. У ролі адваката Маргарытава — **Ф. Чыкановіч,** у ролі Дармідонта — **С. Кац.** 2) Сцэна з спектакля «Наша сям'я», пастаўленага яўрэйскім драмгуртком Мінскай фабрыкі імя Кагановіча па п'есе, напісанай рабочым гэтай-жа фабрыкі М. Гінгольдам. У ролях (злева направа): доктар Абраша — **Фрыдлянд,** пілот Алёша — **Поляк,** Сімхе Цымбал — **Гінгольд** (аўтар п'есы).

Фота І. Каплінскага.

По літаратурных старонках

Сур'ёзна працаваць з пачынаючымі пісьменнікамі

Некалькі год назад газета «Віцебскі рабочы» праводзіла значную работу з пачынаючымі пісьменнікамі, рэгулярна друкавала літаратурныя старонкі. Ад гэтай традыцыі зараз застаўся толькі добры ўспамін. За ўвесь мінулы год ў «Віцебскім рабочым» надрукавана асобна два апавяданні (у маі і кастрычніку) і адна літстаронка (у снежні).

Колькасць змешчаных газетай літаратурных матэрыялаў і, асабліва, іх якасць сведчаць, што з'яўленне іх на старонках газеты—з'ява выпадковая, вынік самапёку. Газета, відаць, друкавала ўсё, што трапляла ў рэдакцыю, не вельмі клапоцячыся аб адборы сапраўды вартых да друку твораў, аб працы з маладымі аўтарамі. Нават над вызначэннем жанру змяшчаемых твораў рэдакцыя не задумвалася. Пераказ баявога эпізода на фронце барацьбы з фінскай белагвардзейшчынай, які пабудаван на фактычным матэрыяле («Подвіг» А. Чуксіна) і мае ўсе адзнакі нарыса, газета дае як апавяданне. Затое нарысам газета назвала твор А. Каршаковай «Таня», хоць ён нічога агульнага з нарысам і наогул з мастацкай творчасцю не мае.

Змест, ідэя гэтага твора вельмі спрэчныя. Мы ведаем цікавую і карысную практыку «Комсомольской правды», якая часта выступае з праблемнымі артыкуламі (па сваёй жыццёвай канкрэтнасці і мастацкай апрацоўцы яны блізка стаяць да нарыса). Гэтыя артыкулы, закранаючы актуальныя праблемы нашай рэчаіснасці, выклікаюць жывы абмен думкамі, яны ўплываюць на фарміраванне новай, савецкай этыкі і маралі. Такое, відаць, значэнне надала рэдакцыя і практыкаванню А. Каршаковай. І зусім дарэмна. Аўтар расказвае пра каханне маладой работніцы Тані да механіка цэха, юнака Сяргея. Ужо з першай сустрэчы «яго жартлівы тон, прыгожы твар спадабаліся ёй». Далей—стрэча ля стадыёна, букет жасміну, паднесены Сяргеем Тані, і—прызнанне ў каханні. Праз год сумеснага жыцця Таня ўпэўніваецца, што Сяргей—эгаіст і пашляк. Неўзабаве ён пакідае Таню. Ідучы з былым мужам на суд,—для спагнання з мужа аліментаў на сына,—Таня трапляе пад трамвай і застаецца бязногай калекай.

Нагрувашчанне жудасцей аўтар заканчвае «аптымістычным» давескам: «З агіднасцю ён (сын Тані і Сяргея) будзе глядзець на свайго бацьку, які ў цяжкую мінуту кінуў яго і яго маці, які страціў бацькоўскія пачуцці». Ніякай праблемнасці ў Каршаковай, вядома, не атрымалася. Няўменне-ж захаваць пэўную меру, знарачытая «афярнасць» у паказе станоўчага тыпу (калецтва Тані) выклікаюць непрыемнае ўражанне.

Надуманае і штучнае апавяданне Міх. Разава «Патрыёт». Змест яго такі. Дапрызыўнік Пётр марыў служыць у Чырвонай Арміі, але атрымаў ільготу па сямейнаму становішчу. Бацькі-калгаснікі адмаўляюцца ад ільготы, і сын ідзе ў армію. Гэтымі падзеямі можна было-б і вычарпаць тэму апавядання. Аднак, нудна і бясстрасна расказаўшы пра перажыванні дапрызыўніка, аўтар прадаўжае апавяданне, паказваючы, што стала з Пятром праз сем год. Доўгі шлях вучобы, росту Пятра сціснут у якіх сорак радкоў сухой «выпіскі з фармулярнага спісу», бачым-жа мы Пятра ўжо лётчыкам-ордэнаносцам, які наведаў родны калгас.

Аўтар не разумее, што такое сюжэт, кампазіцыя мастацкага твора, а рэдакцыя не патурбавалася дапамагчы яму. Яна нават не выправіла мовы твора. А мова яго далёкая ад прынятых норм літаратурнай мовы. Міх. Разаў, напрыклад, піша: «Бацька і маці мноства разоў выходзілі за калітку і, шчурачы прытупленыя гадамі вочы, угледжваліся ў далечыню». Ён ужывае такія небеларускія словы, як: «сястронка». «царыла цішыня», «седзячы на заваленцы», «выбяжала», «дасужыя пытанні», «шчы», «ураніў з рук», «у яе сверкнулі слёзы», і шмат інш.

Лепшае ўражанне ствараюць апавяданне А. Брыскіна «Здабытае шчасце» і нарыс Аляксея Гаравога «Расказ Кандрата». Творы гэтыя навеяны вызваленнем Заходняй Беларусі і Прыбалтыкі, яны цікавы праўдзівымі, жыццёвымі фактамі, расказанымі ў іх. Аднак, рэдакцыя і тут адхілілася ад работы над мовай твораў. У Брыскіна чытаем: «Чоткай ваеннай выпраўкай ішоў ён уздоўж заводскага забора», «Сямён глытаў кожнае слова гэтай дзяўчыны». Брыскін ужывае такія словы: «ізрадна паношаны», «прыют», «круглаліцая», «улыбаючыся», «ворах плацццяў», «ізабілле», «прыстальна».

У літстаронцы змешчана пяць вершаў. Не вызначаючыся арыгінальнасцю, з'яўляючыся першай «спробай пяра» пачынаючых, яны, аднак, не маюць тых відавочных і значных хібаў, якімі адзначана проза, надрукаваная газетай.

Рэдакцыі «Віцебскага рабочага» трэба сур'ёзна заняцца працай з пачынаючымі пісьменнікамі, прыцягнуўшы да яе вопытных літаратараў, якія ёсць у Віцебску. Друкаванне-ж сырых, недапрацаваных твораў, што робіць рэдакцыя цяпер, ідзе не на карысць, а толькі на шкоду іх аўтарам.

У Саюзе пісьменнікаў БССР

У рускай секцыі

Дзяржаўнае выдавецтва пры СНК БССР здало ў друк чарговы альманах рускай секцыі Саюза савецкіх пісьменнікаў БССР. Альманах 1941 года адкрываецца апавяданнем маладога пісьменніка, байца №-й авіячасці, Генадзія Семяніхіна. У альманаху друкуюцца вершы К. Цітова, апавяданні Л. Шапіры, Е. Садоўскага і другіх аўтараў. Упершыню ўведзен аддзел перакладаў твораў беларускіх пісьменнікаў на рускую мову.

У план 1941 года Дзяржаўнае выдавецтва ўключыла перавыданне вядомай кнігі заўчасна памёршага члена рускай секцыі ССП БССР Андрэя Оршына «Этапным парадкам». Кніга павествуе аб канцы мінулага стагоддзя, аб блуканнях рабочага чалавека ў Пецярбургу, аб фарміраванні свядомасці ў селяніна, трапіўшага ў горад.

Секцыя правяла літаратурны вечар на акруговых курсах ваенных бібліятэкараў у Мінскім ДЧА імя Варашылава. З чыткай сваіх твораў выступілі: палкоўнік-ордэнаносец тав. Аляксееў, які закончыў раман з часоў грамадзянскай вайны «Якаў Жэлезноў», пісьменнікі т. т. Л. Шапіра і Е. Садоўскі.

У бліжэйшы час будуць праведзены літаратурныя вечары, прысвечаныя 23 гадавіне РСЧА, у вайсковых часцях, а таксама ў мінскіх рамесленых вучылішчах і школах ФЗА.

У часе прабывання ў Мінску пісьменнік А. С. Новікаў-Прыбой абяцаў падтрымліваць творчую сувязь і аказваць дапамогу маладым рускім пісьменнікам Беларусі. Аўтар «Цусімы» трымае сваё слова. Члены рускай секцыі сістэматычна пасылаюць свае творы ў Маскву на кансультацыю тав. Новікаву-Прыбою. Творчыя парады тав. Новікава-Прыбоя заслухоўваюцца на пасяджэннях секцыі

Е.

У секцыі празаікаў

25 студзеня ў Доме пісьменніка БССР адбыўся агульны сход празаікаў. На сходзе з кароткай інфармацыяй аб планах Дзяржаўнага выдавецтва пры СНК БССР у галіне выдання прозы выступіў рэдактар выдавецтва тав. Латышоў.

Абрана бюро секцыі празаікаў у складзе тт. К. Чорнага (старшыня), Р. Мурашкі і Ю. Дворкінай.

Песня о Тимошенко

Текст Я. Шведова **Музыка М. Иванова**



1) То не вихри-бури
Ходят на Амуре,
Не грозу над Доном
Окликает гром,
То в боях рожденный,
В битвах закаленный,
Едет Тимошенко **(2 раза),**
Сталинский нарком.

2) Грозно, непреклонно
С боем вышли к Гродно,
И разбили пана
На своем пути.
Где он вел походы,—
Радость у народа.
Там полыни горькой **(2 раза).**
Больше не расти.

3) А когда пехота
Шла на вражьи ДОТ'ы,
Нам была секунда
В штурме дорога.
Он учил, как надо
На хвосте снаряда
Нам, бойцам, врываться **(2 раза).**
В логово врага.

4) С маршалом-Наркомом
По боям знакомы,
Мы его назвали
Сталинским орлом.
Маршал скажет слово,—
В бой итти готовы.
За тебя, Отчизна **(2 раза),**
И с тобой, Нарком.

5) То не вихри-бури... и т. д.

Выдатны вучоны-фальклоразнавец

Савецкая фалькларыстыка панесла цяжкую страту. Памёр акадэмік Юрый Матвеевіч Сакалоў.

З імем гэтага выдатнага вучонага непарыўна звязана развіццё рускай навукі аб народнай творчасці ў XX стагоддзі, асабліва яе буйнейшыя поспехі ў савецкі перыяд. Акадэмік Ю. М. Сакалоў быў главой і душой савецкай фалькларыстыкі.

Нарадзіўся Юрый Матвеевіч у 1889 годзе. Бацька яго, Матвей Іванавіч, быў прафесарам старажытнай рускай літаратуры ў Маскоўскім універсітэце. Сустракаючыся з малых год у доме бацькоў з вядомымі рускімі філолагамі і фалькларыстамі, Юрый Матвеевіч пранікаецца любоўю да паэтычнай творчасці рускага народа. Вывучэнню багаццяў народнай творчасці ён, разам з братам-блізняцом Барысам, прысвячае ўсё сваё жыццё.

Ужо ў 1908 годзе маладыя студэнты браты Сакаловы едуць у Ноўгарадскую губерню для збірання фальклору. Рэзультатам гэтай экспедыцыі з'явілася апублікаваная ў 1915 годзе вялікая праца «Казкі і песні Белазёрскага края», якая да гэтага часу лічыцца ўзорам навуковай публікацыі фальклору. Новае ў гэтай працы — спалучэнне вывучэння фальклору з вывучэннем носьбітаў і стваральнікаў яго. Глыбокая ўвага да майстроў народнай творчасці асабліва характарызуе Юрыя Матвеевіча як фалькларыста.

З часу сваёй першай экспедыцыі ў Белазёрскі край Юрый Матвеевіч не спыняе плённай работы ў галіне фалькларыстыкі.

Асабліва кіпучую дзейнасць разгортвае Юрый Матвеевіч у савецкія годы, калі справе развіцця народнай творчасці ў СССР надаецца сапраўды дзяржаўны размах. Ён арганізоўвае рад фальклорных экспедыцый, сярод якіх найбольшай увагі заслугоўвае вядомая экспедыцыя «Па слядах Рыбнікава і Гільфердзінга» — у раёны Онежскага і Кемь-возера. Экспедыцыя адзначыла не толькі жывучасць рускай былліннай традыцыі на Поўначы, але выявіла і новых таленавітых майстроў-сказальнікаў.

За 32 годы навукова-даследчай дзейнасці з-пад пяра Юрыя Матвеевіча выйшла каля 200 навуковых работ—манаграфій, зборнікаў, артыкулаў.

Акадэмік Ю. М. Сакалоў стварыў першы падручнік па фальклору, па якім выхоўваюцца тысячы студэнтаў нашых літаратурных факультэтаў, пранікаючыся павагай і любоўю да творчасці народаў СССР. Юрый Матвеевіч вёў аграмадную педагагічную работу ў ВНУ Масквы і іншых гарадоў, кіраваў падрыхтоўкай аспірантаў і выхаваў плеяду таленавітых вучняў, сярод якіх многія з'яўляюцца зараз віднымі фалькларыстамі, вядучымі самастойную работу.

Лабараторыя гэтага выдатнага вучонага-даследчыка, выхаванага на лепшых традыцыях рускай фалькларыстыкі, не абмяжоўвалася сценамі яго кабінета, а пашыралася на неабсяжныя прасторы ўсёй краіны, дзе жыве, працуе і творыць культурныя каштоўнасці шматнацыянальны савецкі народ.

Глыбіня навуковага аналізу спалучалася ў Юрыя Матвеевіча з вялікім арганізатарскім талентам. Акадэмік Ю. М. Сакалоў да апошняга часу ўзначальваў фальклоразнаўчы ўчастак савецкай навукі. Ён быў стваральнікам першай кафедры фальклору ў Маскве, кіраваў секцыяй народнай творчасці Саюза савецкіх пісьменнікаў СССР, узначальваў Інстытут украінскага фальклору. Ён быў смелым наватарам у навуцы аб народнай творчасці. Юрый Матвеевіч з'яўляецца ініцыятарам арганізацыі злётаў і канферэнцый народных сказальнікаў і спевакоў. Ім упершыню высунут тэзіс аб творчай дапамозе народным талентам, адыграўшы выключную ролю ў развіцці савецкага фальклору. Акадэміку Сакалову належыць чэсць выяўлення многіх адароных сказальнікаў, казачнікаў, песняроў, каторымі так багата савецкая краіна. Таму, на сваім юбілеі Юрый Матвеевіч з законнай гордасцю мог заявіць: «Я думаю, што ў адных адносінах я шчаслівей усіх прысутных: наўрад ці сустракаў хто з вас на працягу свайго жыцця так многа таленавітых людзей, як я. Я меў шчасце знаходзіць іх і сярод бязграматных. Усё жыццё я меў узаемадачыненне з майстрамі народнай творчасці».

Пішучаму гэтыя радкі давялося бачыць на Усекарэльскай канферэнцыі майстроў народнай творчасці ў Петразаводску, з якой любоўю, як запраста, па-сяброўску гаварыў акадэмік Сакалоў з сівабародымі сказальнікамі рускіх былін і выканаўцамі рун Калевалы. Адчувалася, што «Ён Матвеіч», як любоўна называлі яго карэльскія быліннікі, з'яўляецца блізкім і дарагім для кожнага народнага паэта, лепшым яго дарадчыкам, настаўнікам і другам. У гэтым як не трэба лепш праяўлялася еднанне савецкай перадавой навукі з народам. Акадэміка Сакалова ведалі і аднолькава любілі акыны Казахстана, ашугі Каўказа, беламорскія сказальнікі і беларускія народныя песняры. Пабываўшыя на злёце ў Маскве беларускія сказальнікі Марыя Валчок, Яўхім Мятліцкі і Абрам Фрыдман з захапленнем адзываліся аб гэтым выключным вучоным.

Клопатамі аб развіцці народнай творчасці было запоўнена ўсё жыццё Ю. М. Сакалова— выдатнага вучонага і палымянага патрыёта сацыялістычнай радзімы.

Ю. М. Сакалоў праяўляў асаблівую цікавасць да квітнеючага фальклору народаў СССР, у тым ліку і беларускага.

Для беларускіх фалькларыстаў светлы вобраз акадэміка Ю. М. Сакалова заўсёды будзе з'яўляцца ўзорам сапраўднага савецкага вучонага. усё сваё жыццё аддаўшага служэнню народу.

М. ГРЫНБЛАТ.

Б. Смольскі

Джузеппе Вердзі

Споўнілася 40 год з дня смерці геніяльнага італьянскага кампазітара Джузеппе Вердзі. Імя Вердзі заўсёды можна сустрэць у рэпертуары музыкальных тэатраў, у гісторыі якіх ён адыграў велізарную ролю, а таксама ў праграмах камерных, эстрадных канцэртаў і ў выступленнях мастацкай самадзейнасці.

Вердзі з'яўляецца адным з самых папулярных і любімых італьянскіх кампазітараў у нашай краіне. Яго лепшыя оперы: «Рыгалетто», «Травіята», «Трубадур», «Аіда» і «Отэлло» не сыходзяць са сцэны тэатраў, нязменна прыцягваючы самую шырокую аўдыторыю. Сам кампазітар з жартаўлівай гордасцю гаварыў: «Мая музыка пранікла скрозь да самых далёкіх куточкаў Афрыкі і Індыі...»

Нягледзячы на сусветную вядомасць, на грандыёзны поспех сваіх опер і папулярнасць, Вердзі на працягу жыцця часта паўтараў, што ён па сваёй натуры заўсёды быў, ёсць і застанецца простым італьянскім селянінам. У гэтых словах ёсць вялікая доля шчырасці і праўды.

Музыка Вердзі сапраўды арганічна звязана з народнай творчасцю і сваімі карэннямі глыбока ўваходзіць у сялянскі і гарадскі мелас Італіі; у сваю чаргу, яго арыі, песні, каваціны з опер распяваюць у самых разнастайных колах гарадоў і вёсак.

Вердзі ў сваёй музыцы быў заўсёды глыбока шчырым і праўдзівым мастаком. Уся яго кампазітарская дзейнасць з'явілася поўным і закончаным выражэннем яго ідэйна-мастацкіх перакананняў, яго эстэтыкі. якая сфарміравалася ў годы вялікага пералому ў гісторыі італьянскай опернай школы. У гераічную эпоху сваёй радзімы, калі яна змагалася за нацыянальнае вызваленне, Вердзі часта называлі «маэстра італьянскай рэвалюцыі». Сапраўды, пасля віртуозных арый Расіні, лірыкі Белліні—музыка Вердзі хвалявала сваёй гераічнай накіраванасцю, страснасцю, энергіяй і мужнай воляй.

Вердзі нарадзіўся 10 кастрычніка 1813 года ў вёсцы Ранколе, недалёка ад гарадка Буссето. Выхаванец з народа, ён прайшоў суровы шлях жыцця ад беднага правінцыяльнага арганіста ў Буссето да сусветнага прызнання. Любоў да музыкі праявілася ў яго ў раннім маленстве, але атрымаць колькі-небудзь добрую музычную адукацыю беднаму сялянскаму сыну было цяжка, і аўтар выдатных опер фактычна з'яўляўся геніяльным самавукам.

У першае дзесяцігоддзе сваёй опернай кар'еры Вердзі, ахоплены агульным парывам нацыянальна-вызваленчага руху, становіцца сапраўдным народным кампазітарам-трыбунам, натхнёным песняром сваёй краіны. Яго захапленне нацыянальна-вызваленчым рухам у 40-я годы мінулага стагоддзя выразілася ў стварэнні трох вялікіх опер: «Навухаданосар»—на тэму з гісторыі гераічнай барацьбы яўрэйскага народа, «Ламбардцы»— з гісторыі барацьбы італьянскіх рыцараў супроць нашэсця сарацынаў і «Эрнані»—паводле твора выдатнага французскага пісьменніка-рамантыка Віктара Гюго. Оперы гэтыя напісаны на гераічныя сюжэты. Для італьянскіх слухачоў, ахопленых у той час страсным пратэстам супроць прыгнятальнікаў, яны гучалі як заклік да паўстання. Вердзі працаваў нібы з пэўнай мэтавай устаноўкай—выконваючы грандыёзны сацыяльны заказ.

У творчасці Вердзі 50-х год яго спачуванне да прыгнечаных, любоў да людзей атрымліваюць новае мастацкае ўвасабленне. Цэнтральнай фігурай опернай творчасці Вердзі становіцца чалавек з яго пакутамі і радасцямі, чалавек, які ў сілу сацыяльнай няроўнасці пастаўлен у цяжкое становішча. Кампазітара вабіць трагічны вобраз смяючагася скрозь слёзы шута-уродца Рыгалетто, які траціць дачку, сваю адзіную ўцеху. Опера «Рыгалетто» упершыню была пастаўлена ў Венецыі ў тэатры Фенічэ ў 1851 годзе. Пабудавана яна на аснове драмы В. Гюго «Кароль забаўляецца». Прэм'ера оперы прайшла з трыумфам. Поспех оперы быў зусім заслужаны: «Рыгалетто»—адзін з бясспрэчна геніяльных твораў Вердзі.

Вабіць Вердзі і вобраз Віолетты, пакутуючай жанчыны — афяры акружаючага асяроддзя, якое адмаўляе ёй у праве на каханне, на шчасце. Лібрэта оперы «Травіята» заснавана на драме А. Дюма-сына «Дама з камеліямі». Оперы «Рыгалетто» і «Травіята» сведчаць аб тым, што дзейнасць Вердзі ў 50-х годах адзначана пошукамі ідэйна-насычанага зместу, імкненнем да праўдзівасці і жыццёвасці ў абрысоўцы чалавечых перажыванняў.

Ужо для сваіх ранніх опер Вердзі адбірае сюжэты сярод выдатных узораў класічнай літаратуры Шэкспіра («Макбет»), Шылера («Луіза Міллер», «Разбойнікі») Байрана («Карсэр»), Гюго («Эрнані»). Стварэннем опер «Рыгалетто», «Травіята», «Трубадур» Вердзі дасягае такой вышыні ў праўдзівасці і непасрэднасці выражэння чалавечых пачуццяў, якой не ведала да яго італьянская опера нават у творах Расіні.

У 60-я годы Вердзі знаёміцца з прынцыпамі опернай рэформы Вагнера і з яго творчасцю. Жывучы ў гэты час пераважна ў Парыжы, Вердзі чытае тэарэтычныя працы геніяльнага нямецкага кампазітара-драматурга. Ён піша адну оперу за другой, не абмяжоўваючыся толькі італьянскімі операмі і для італьянскай сцэны «Сымон Боканегра» (Венецыя) і «Бал-маскарад» (Рым), а піша оперу «Сіцылійская вячэра» для сцэны парыжскай Гранд-оперы, оперу «Сіла лёсу» для Пецярбургскага тэатра і іншыя.

Гэтыя оперы паказалі, што кампазітар, крытычна выкарыстоўваючы сродкі навейшых оперных школ і арганічна падпарадкоўваючы гэтыя сродкі сваім асноўным творчым прынцыпам, стварыў рад высокамастацкіх твораў, якія ў сваю чаргу падрыхтавалі стварэнне трох апошніх, самых геніяльных опер Вердзі: «Аіда», «Отэлло» і «Фальстаф» (камічная).

У 1872 годзе Вердзі стварае дзівосную гукавую фрэску — оперу «Аіда», у аснове якой ляжыць старажытная егіпецкая легенда. Праз чатырнаццаць год пасля гэтага ён піша музыкальную трагедыю «Отэлло» па сюжэту Шэкспіра. «Отэлло» займае асобнае месца ў яго творчасці і ў гісторыі італьянскай оперы. Праз шэсць год, ва ўзросце ўжо 80 год, Вердзі піша сваю апошнюю оперу — «Фальстаф», бяспрыкладны творчы подзвіг, які сведчыць аб велізарнай жыццёздольнасці, неўгамаванай волі, энергіі кампазітара. Опера-буфф «Фальстаф» (па Шэкспіру) з'яўляецца вяршыняй італьянскай камічнай оперы.

Лепшыя творы позняга Вердзі —«Аіда», «Отэлло» і «Фальстаф»—былі апошняй яркай успышкай яго творчага генія. Гэтыя выдатныя творы нібы падвялі вынік эпохі росквіту італьянскай класічнай оперы. 27 студзеня 1901 года геніяльны кампазітар памёр, акружаны славай і сусветным прызнаннем.

Оперы Вердзі, асабліва «Рыгалетто», «Травіята», «Трубадур», «Аіда» і «Отэлло» з'яўляюцца аднымі з самых лепшых музыкальных драм у сусветнай опернай літаратуры. Геніяльная прастата і сіла ў паказе чалавечай драмы ставіць іх у рад з найвялікшымі драматургічнымі творамі літаратуры і мастацтва. Праўдзівасць і сіла выражэння чалавечых пачуццяў, высокая мастацкасць і ў той-жа час даступнасць музыкі, яе народнасць і чалавечнасць абумовілі выключную папулярнасць опер Вердзі.

Беларуская проза за 1940 год

Па рашэнню праўлення Саюза савецкіх пісьменнікаў БССР, 10 лютага а 8 гадзіне ўвечары ў Доме пісьменніка адкрыецца творчая канферэнцыя пісьменнікаў Мінска.

На канферэнцыі будзе абмеркавана беларуская проза за 1940 год. З дакладамі выступяць тт. Ю. Дворкіна і М. Клімковіч.

На сход запрашаюцца чытачы.

Адказны рэдактар І. Д. ГУРСКІ.